ПРОЛЕТАРЫ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

№ 111 (3219) Нядзеля, 19-га Мая 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ВІЛЬНЯ, 18. Згарэла амаль што цалкам м. Іўе, Валожынскага павету. Засталося толькі некалькі дамоў на Віленскай вуліцы. 550 сем'яў засталіся без даху над галавою.

ВАРШАВА, 18. Недалёка ад Ліды упаў і разьбіўся вайсковы самалёт «Спад 61». Летнік забіты на месцы. Апарат зусім зьнішчаны.

У г. Суражы (Віцебскай акр.) памёр П. В. Румянцаў—стары рэвалюцыянэр, на кватэры якога адбываўся першы зьезд РСДРП

За адмаўленьне ехаць ў вёску на работу Менская біржа працы зьняла з вучоту 20 зубных дактароў

Аб ходзе падрыхтоўчай работы па праверцы і чыстцы партыі

Пастанова Бюро ЦК і Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

1. Адзначыць, што не зважаючы на праведзеную работу па растлумачэньні і падрыхтоўцы да праверкі і чысткі партыі, усё-ж на мясцох ёсьць рад выпадкаў скажэньня і неразуменьня прынцыповай і ідэйнай установак па праверцы і чыстцы партыі, а таксама ў радзе месц слаба практычная работа партарганізацый па падрыхтоўцы да праверкі і чысткі партыі, іменна:

а) У шмат выпадках характарыстыкі складзены РК КП(б)Б аб працы і становішчы ў ячэйцы зусім нездавальняюча, не даюць магчымасьці судзіць аб працы парт. ячэйкі.

б) Частыя выпадкі боязьні адкрытых ячэйкавых сходаў па пытаньнях аб праверцы і чыстцы партыі, у сувязі з чым у некаторых мясцох праводзіліся закрытыя сходы.

в) Наглядаюцца на мясцох выпадкі падыходу да ацэнкі камуністага ня як ён праводзіць лінію партыі, а нярэдка выяўляецца склочніцтва, мяшчанства, што скажаюць прынцыповую ўстаноўку партыі па праверцы і чыстцы партыі.

г) Недастатковая ўвага з боку АК па падрыхтоўцы да чысткі партыі і амаль што адсутнічаньне з іх боку кантролю праверкі правядзеньня гэтай работы райкомамі КП(б)Б і ячэйкамі.

д) Адсутнасьць сыстэматычнага асьвятленьня ў друку аб ходзе падрыхтоўчых работ і мабілізацыі партыйнай масы і рабочае клясы вакол праверкі і чысткі партыі.

Усё гэта кажа аб тым, што на мясцох ня было дастатковай сур'ёзнай растлумачальнай і падрыхтоўчай работы, недастаткова мабілізацыя ўсёй партыйнай масы і рабочае клясы вакол праверкі і чысткі партыі.

2. Абавязаць зараз-жа ўсе АК і АКК КП(б)Б мабілізаваць неабходныя сілы і накіраваць для ўзмацненьня падрыхтоўчай работы ў першую чаргу на вёсцы і там, дзе слаба гэта работа была праведзена, устанавіць сыстэматычную праверку з боку АК, як на мясцох гэта работа праводзіцца.

Тым ячэйкам і арганізацыям, дзе было дапушчана скажэньне правільнай пастаноўкі праверкі і чысткі партыі і дапушчана склочніцтва і г. д. ужыць захады да растлумачэньня і выпраўленьня дапушчаных памылак.

Абавязаць усе АК зараз праверыць якасьць складаемых РК характарыстык ячэек у ўжыць захады, каб складаемыя характарыстыкі сапраўды адбівалі работу і становішча ячэйкі.

3. Абавязаць усе АК разам з АКК КП(б)Б усіх членаў праверкомаў аслабаніць цяпер-жа ад партыйнай і іншай грамадзкай нагрузкі, забясьпечыўшы ім магчымасьць падрыхтавацца да работы па праверцы і чыстцы партыі, адначасова ўжыўшы захады, каб члены праверкомаў, пасылаемыя для праверкі і чысткі партыі, былі своячасова аслабонены ад работы.

Абавязаць АК і РК КП(б)Б заразжа мабілізаваць для праверкомаў у парадку грамадзкай нагрузкі тэхнічных работнікаў: АКК забясьпечыць дастатковае іх інструктаваньне.

4. Правесьці па ўсіх акругах падрыхтоўку адабраных таварышоў у праверкомы сіламі ЦК і ЦКК шляхам арганізацыі курсаў (вывучэньне пастаноў 16 партканфэрэнцыі, інструкцыі аб праверцы і чыстцы і г. д.) з такім разьлікам, каб гэта работа была скончана да пачатку чысткі вясковых арганізацый.

5. Праверку і чыстку КП(б)Б пачаць: вайсковых партарганізацый З 25 МАЯ, скончыць да 1-га чэрвеня; НА ВЁСЦЫ—вясковых партарганізацый пачаць З 10-га ЧЭРВЕНЯ І СКОНЧЫЦЬ ДА 1-га ЖНІЎНЯ; З 15-га ЖНІЎНЯ пачаць чыстку савецкіх ячэек, па сканчэньні іх—вузаўскіх, рабочых і пагранічнай варты.

Усім АК і АКК, выходзячы з гэтага, скласьці плян работ па праверцы і чыстцы партыі і прадставіць ЦКК не пазьней 1-га чэрвеня.

6. Прыступіць зараз-жа да праверкі ўсіх членаў бюро АК і прэзыдыуму АКК і роўных ім армейскіх арганізацый.

7. Абавязаць цэнтральныя газэты штодня да пачатку праверкі і чысткі партыі, так і ў часе чысткі асьвятляць ход гэтае работы, мабілізуючы як партыйную масу, так і рабочую клясу. Абавязаць усе АК ужыць захады да ўзмацненьня работы ў гэтым напрамку мясцовых і насьценных газэт.

Захоп Літвы Польшчаю---на парадку дня

Генэрал Мінкевіч звольнен за правал дывэрсыйнай работы ў Літве

ПІЛСУДЗКІ Ў ВІЛЬНІ ПАДРЫХТОЎВАЕ ПЛЯН ЗАХОПУ ЛІТВЫ

ВІЛЬНЯ, 18. На днях нечакана вышоў у адстаўку камандзір польскага корпусу аховы пагранічча Мінкевіч. Весткі, якія паступаюць з Віленшчыны, высьвятляюць прычыны гэтай адстаўкі. Як вядома, генэрал Мінкевіч быў нечакана звольнены з займаемай пасады, а яго паперы апячатаны. У зьвязку з яго адстаўкай маршал Пілсудзкі апублікаваў рэзкі ліст, які нарабіў шмат шуму, але ня высьвятліў прычыны гэтай адстаўкі. Як аказваецца, генэрал Мінкевіч кіраваў польскай дывэрсыйнай работай у Літве і выступленьнямі літоўскай эміграцыі супроць ураду Вальдэмараса. Адстаўка Мінкевіча выклікана апошнімі падзеямі ў Літве і няўдачнымі выступленьнямі польскіх агентаў.

Акрамя генэрала Мінкевіча з корпусу аховы пагранічча звольнена яшчэ звыш 50 афіцэраў, у ліку якіх шмат легіянэраў з 1-й брыгады. Апячатаньне папер Мінкевіча выклікана небясьпекай вельмі непажаданых выкрыцьцяў з боку гэтага генэрала. Існавала небясьпека, што Мінкевіч пасьледуе прыкладу былога прэм'ера Бартэля, які, уходзячы ў адстаўку, узяў з сабой шмат кампрамітуючых польскі ўрад дакумантаў.

Наступнікам Мінкевіча на пасту камандзіра корпусу аховы пагранічча, а таксама кіраўніка антылітоўскай работай назначаны камандзір аднэй з дывізый генэрал Тэсаро. (ТАСС).

Польшча прачышчае шлях да нападу на СССР

Імпэрыялізм фашысцкай Польшчы пад шумок пацыфісцкіх фраз, прыкрываючыся подпісам маскоўскага пратаколу, падрыхтоўвае крывавую бойню, прыступае да рэалізацыі сваіх захопных плянаў.

Таямнічая адстаўка камандзіра пагранічнага корпусу Мінкевіча дала на днях выразнае выяўленьне ўсёй ваеннай авантуры крывавага дыктатара Пілсудзкага. Мінкевічу, літоўскага паходжэньня, было даручана пры дапамозе літоўскіх сацыял-дэмакратаў з Плечкайцісам на чале зрабіць забойства Вальдэмараса, падняць абурэньне ў Літве, словам інсцэніраваць новую жэлігоўшчыну, каб прагнынуць Літву, прытаптаць яе фашысцкім ботам, як гэта зроблена з Зах. Беларусіяй і Зах. Украінай.

Замах на Вальдэмарса ня ўдаўся, генэрал Мінкевіч не справіўся з дырэктывамі палкоўніцкай групы і дыктатара Пілсудзкага. Вось чаму Мінкевіч быў зьняты з паста, а на месца яго назначаны новы генэрал.

Аднак, гэтая няўдача Пілсудзкага ні на момант не памяншае небясьпекі захопу Літвы, захопу, які можа ўзьнікнуць зусім нечакана і раптоўна, бо падрыхтоўка да паходу на Літву адбываецца з ліхаманкавай пасьпяховасьцю, праводзіцца штодзённа.

Паездка Пілсудзкага ў Віленшчыну, дзе ён па вестках польскіх газэт мае кіраваць «ваеннымі гульнямі» паказвае, што пад гэтымі гульнямі трэба разумець новую падрыхтоўку дывэрсый, складаньне новых плянаў для захопу Літвы, якая стаіць на дарозе да нападу на СССР. Пілсудзкі пасьпяшыў прыехаць у Вільню, каб папраўіць і наладзіць няўдаўшыйся захоп Літвы, які стаіць на парадку дня ваяўнічага польскага фашызму, падкармліваемага Англіяй.

Арганізаваньне напётаў басмачоў на тэрыторыю БССР, сьпешная падрыхтоўка да збройнай інтэрвэнцыі Літвы, каншахты Польшчы з Латвіяй—вось дзеяньні міжнароднай імпэрыялістычнай пружыны, якую націскае ўсё мацней і з большай нахабнасьцю Чэмбэрленаўская Англія, вось сымптомы наблі.жаючага генэральнага нападу на Саюз Рабоча-сялянскіх рэспублік.

Пераатасоўка камандных кадраў у пагранічным корпусе, умацаваньне кіраўніцтва пілсудчыкаў у «Стрэльцу»—гэтай фашысцкай гвардыі Пілсудзкага паездка Пілсудзкага ў Вільню, шалёная атака фашызму на кампартыю, як нячуваны прысуд на працэсе «35» у Беластоку, забойства выдатнейшага польскага камуністага Паншына—вось апошнія падзеі, якія яскрава выяўляюць сьпешную падрыхтоўку Польшчы да вайны.

Да захопу Літвы пхае Польшчу і яе гаспадарчы крызіс, які шпарка паглыбляецца. Прамыслоўцы шукаюць рынкаў збыту, абшарнікі чакаюць звароту сваіх маёнткаў, фашысцкая дыктатура хоча аддягнуць вайной увагу працоўных і эксплёатаваных мас ад клясавай рэвалюцыйнай барацьбы.

Так, паход на Літву на парадку дня. Польскі імпэрыялізм імкнецца хутчэй забясьпечыць сабе тыл для нападу на СССР, таму стараецца прыдушыць рэвалюцыйны рух у Зах. Беларусі і ў Зах. Украіне. Сацыял-дэмакраты Літвы, ППС у Польшчы, беларускія і украінскія згоднікі—гэтыя адданыя псы фашызму—старанна дамагаюць ажыцьцяўленьню крывавых замыслаў польскага імпэрыялізму.

Паны-фашысты, ап'янелыя крывавым чадам, лезуць на ражон. Рабочыя і працоўнае сялянства ўжо ня раз прадэманстравалі сваю гатоўнасьць зьдейсьніць лёзунгі: вайна—імпэрыялістычнай вайне, за абарону СССР! Гульня пана Пілсудзкага ў «ваенныя гульні»—ёсьць гульня з агнём, які спаліць фашысцкую Польшчу. Рабочыя і працоўнае сялянства, кіруемыя кампартыяй, не дазволяць сябе абарочваць у гарматнае мяса для інтарэсаў капіталістыс і абшарнікаў, для вялікадзяржаўных інтарэсаў фашысцкай Польшчы.

АН. СТАЛЕВІЧ.

Да праверкі нацработы

У Менск прыехаў прадстаўнік ЦКК УсеКП(б), старшыня ЦКК КП(б) Украіны т. ЗАТОНСКІ дзеля праверкі практыкі нацработы ў БССР.

Камісія ЦКК ставіць сваёй асноўнай задачай—падрабязна выявіць як ленінскае разуменьне нацпытаньня знаходзіць практычны адбітак ў гаспадарчай, культурнай і палітычнай рабоце КП(б)Б, з якімі памылкамі, ухіламі, цяжкасьцямі і перашкодамі КП(б)Б сустракалася і сустракаецца ў практычным разьвязваньні нацыянальнага пытаньня; як практыка нацработы дапамагала і дапамагае замацаванню ў БССР дыктатуры пралетарыяту і яе вышэйшай форме саюзу рабочых з бедняцка-серадняцкімі масамі сялянства; як ў працэсе ўсёй работы КП(б)Б ствараліся неабходныя умовы для інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных, замацоўвалася і паглыблялася шчыльная і неразрыўная сувязь БССР з Савецкім Саюзам і інш. братнімі рэспублікамі.

Камісія ЦКК разам з праверкай становішча нацработы і практычнай дапамогай далейшаму паглыбленьню нацработы, пры актыўным удзеле адказных работнікаў БССР ставіць сваёй мэтай—сабраць канкрэтны і фактычны лічбовы матар'ял, які разам з матар'ялам іншых савецкіх рэспублік зьявіцца каштоўным і вельмі карысным укладам ў вопыт нацработы нашай партыі ва ўсесаюзным маштабе.

У дэталёва-распрацаванай праграме сваёй работы, камісія закранае наступныя нацыянальныя праблемы:

1) АБ УЗАЕМААДНОСІНАХ БССР З СССР (па лініі каштарысу, пяцігодцы, канстытуцыі).

2) АБ ПРАЦЭСЕ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ (партыі, камсамолу, прафсаюзаў, савецкага апарату, Чырвонай арміі, школы, палітасьветных і навуковых устаноў, прэсы, выдавецтва і г. д.).

3) АБ РАБОЦЕ СЯРОД НАЦМЕНШАСЬЦЯЎ.

Правільнае і пасьпяховае вырашэньне усіх гэтых, зьвязаных з праверкай практыкі нацработы ў БССР задач, ў значнай ступені будзе залежыць ад актыўнасьці, практычнай дапамогі і непасрэднага ўдзелу ў рабоце камісіі ня толькі з боку арганізацый і ўстаноў БССР, але і паасобных партыйцаў, камсамольцаў, рабочых, сялян і ўсёй савецкай грамадзкасьці.

Усе на дапамогу камісіі ЦКК УсеКП(б).

Б. СТАСЕВІЧ.

Пасяджэньне камісіі ЦКК УсеКП(б) з кіраўнікамі цэнтральных устаноў

Учора ў залі пасяджэньняў ЦК КП(б)Б адбылося пасяджэньне камісіі ЦКК УсеКП(б) з кіраўнікамі цэнтральных устаноў па пытаньнях абсьледваньня практыкі правядзеньня нацыянальнай работы ў БССР.

Даклад аб задачах абсьледваньня камісіі зрабіў тав. Затонскі, прадстаўнік ЦКК УсеКП(б).

Тав. Затонскі адзначыў, што практыцы абсьледваньня нацыянальнай работы ў асобных рэспубліках надаецца асаблівае значэньне. Маецца на увазе у гэтым годзе склікаць нацыянальную нараду для падвядзеньня вынікаў па нацрабоце у асобных рэспубліках. Такая нацнарада была ў 1923 г., але з таго часу умовы зусім перамяніліся.

Зараз перад камісіяй, якая пачынае працу прадстаіць вялікая і складаная работа у чым кіраўнікі цэнтральных устаноў і грамадзкасьць павінны усямерна дапамагчы ёй.

Па дакладу т. Затонскага выказаліся наступныя таварышы: ДУБІНА, БЭЙЛІН, БАЛІЦКІ, МАСЮКОЎ, УНАРОЎСКІ, ПЛАТУН, СЯНКЕВІЧ, АГУРСКІ, ЛАСТОЎСКІ і Ус. ІГНАТОЎСКІ.

* * *

У наступным нумары газэты падамо падрабязна справаздачу пасяджэньня (даклад т. Затонскага і спрэчкі).

Перад парляманцкімі выбарамі ў Англіі

Забастоўка тэкстыльшчыкаў у Ёркшыры

Прадпрыемцы Лянкашыру пагражаюць лёкаутам 200.000 рабочых

ЛЁНДАН, 17. Беспрацоўе паранейшаму застаецца галоўным пытаньнем пры выбарчай барацьбе, якая наогул працякае без яскравых падзей. У тых выбарчых акругах, дзе перавышае рыбная лоўля, машынабудаўнічая прамысловасьць і г. д. лібэральныя кандыдаты і кандыдаты рабочай партыі настойліва высоўваюць на першы плян неабходнасьць аднаўленьня ангельска-савецкіх адносін. Добрае надвор'е, якое стаіць у апошні час, садзейнічае прадвыбарчай агітацыі рабочай партыі і камуністых, бо дазваляе ім наладжваць мітынгі пад адкрытым небам, якія каштуюць вельмі танна і зьяўляюцца бязмоўнай перавагай рабочай партыі і камуністых у параўнаньні з лібэраламі і кансэрватарамі.

Як паказваюць апошнія паведамленьні з выбарчых акруг, стварыліся спрыяючыя ўмовы для камуністычных кандыдатаў у Шатлянды. Сьвята сёмуха 19-20-га мая відавочна паслабіць выбарчую барацьбу на бліжэйшыя дні, асабліва ў некаторых лаўночных акругах, дзе звычайна на семуху адбываюцца рэлігійныя цэрамоніі. Паслабленьню выбарчай барацьбы ў бліжэйшыя дні будуць садзейнічаць таксама масавыя паездкі за горад і на курорты на сьвята.

Трэба адзначыць, што ў Ланкашыры і Ёркшыры, дзе рэлігійныя цэрамоніі зьвязаныя з сёмухай наладжваюцца вельмі ўрачыста, якраз у гэтыя дні насьпеў сур'ёзны прамысловы крызіс. У далёце ракі Кольдэр **у Ёркшыры забаставалі 2.500 тэкстыльшчыкаў у знак пратэсту супроць скарачэньня заработнай платы на 10 проц.** Скарачэньне заработнай платы пагражае рабочым і ў радзе іншых акруг, дзе таксама магчыма забастоўка, якая можа закрануць амаль **100 тысяч рабочых. Уласьнікі тэкстыльных прадпрыемстваў Ланкашыру пагражаюць абвясьціць лёкаут 200.000 рабочых** у якасьці ўзьдзейнічаньня за тое, што ня гледзячы на ўсе намаганьні прафсаюзу, рабочыя прадпрыемстваў у Альдгэйме, што бастуюць в сакавіка месяца супроць скарачэньня заработнай платы, не згаджаюцца аднавіць работу. Калі крызіс у Ланкашыры і Ёркшыры разгорнецца і прывядзе да спыненьня работы на прадпрыемствах напярэдадні усеагульных выбараў, дык палітычныя вынікі яго, бясспрэчна, будуць вельмі значныя і моцна ўзьнімуць шансы рабочай партыі. (ТАСС).

ПАДРЫХТОЎКА ВАЙНЫ СУПРОЦЬ ФЫНЬ ЮЙ-СЯНА

ПЭЙПІН, 17. Амэрыканскі «Дэйлі Літэр», робячы параўнаньне паходу Чан Кай-шы супроць гуансійскай групоўкі ў Хубэйскай правінцыі з цяперашняй падрыхтоўкай вайны супроць Фынь Юй-сяна, заяўляе, што ў першым выпадку ўся краіна падтрымлівала Чан Кай-шы паколькі гуансійцы былі віноўнікамі няшчасьцяў. Што-ж датычыцца Фынь Юй-сяна, дык ён наадварот увесь час дэкляраваў сваю лёяльнасьць у адносінах да нацыянальнага ўраду. Газэта лічыць, што Чан Кай-шы нясе адказнасьць за працяг грамадзянскай вайны ў Кітаі. (ТАСС).

Заява Ўдавы Сун Ят-сэна

БЭРЛІН, 13. Суп Цзін-лін, удава Сун Ят-сэна падала ў Бэрліне прадстаўніком друку перад сваім ад'ездам у Кітай наступную заяву: «Я еду ў Кітай, каб прысутнічаць пры перанясеньні праху доктара Сун Ят-сэна ў «Пурпуровыя горы», дзе ён жадаў быць пахаваным. Каб унікнуць якіх-небудзь непаразуменьняў я навіна заявіць, **што самым рашучым чынам трымаюся выказанага ў маёй дэклярацыі, зробленай у Ханькоу 14-га ліпеня 1927 году, у якой адвяшчалася аб маім адыходзе ад актыўнага ўдзелу ў рабоце Гаміндану, з прычыны контр-рэвалюцыйнай палітыкі і дзейнасьці цэнтральнага выканаўчага камітэту партыі Гаміндан».**

Заўвага: У дэклярацыі, апублікаванай 14-га ліпеня 1927 г., Сун Цзун-лін падрабязна выклала погляды Сун Ят-сэна на аграрную рэвалюцыю і на рашаючую ролю рабочых і сялян у кітайскай рэвалюцыі. Сун Цзін-лін у гэтай дэклярацыі выкрывала контр-рэвалюцыйную ролю лідэраў Гаміндану, якія называюць сябе вучнямі Суп Ят-сэну, а на справе сталі зброяй мілітарыстых па прытпечаньні рабочых і сялянскіх мас Кітаю. (ТАСС).

Забарона ўезду ў Англію савецкай дэлегацыі

МАСКВА, 17. Дэлегаты савецкай каапэрацыі на кангрэс ангельскіх жаночых каапэрацыйных гільдый т. Бутузавай забаронены ўезд у Англію. Кангрэс, які адбыўся ў горадзе Стоک-Он-Трэнт, на якім прысутнічала 1.200 дэлегатак, адпагалосна пастанавіў пратэставаць супроць забарны ўезду ў Англію т. Бутузавай. Кангрэс пастанавіў дабівацца ўзмацненьня разьвіцця каапэрацыйнага гандлю паміж Англіяй і СССР і аднаўленьня дыпляматычных адносін паміж абедзьвюма краінамі. Кангрэсам ухвалена таксама рэзалюцыя, якая вітае савецкія прапановы аб разбраеньні.

Ад імя Цэнтрасаюзу на кангрэсе выступіў з прывітаньнем дырэктар Лёнданскага прадстаўніцтва Цэнтрасаюзу т. Гурэвіч. (ТАСС).

Працоўны БССР заўсёды гатовы дапамагчы

гэраічнаму пралетарыяту Нямеччыны

РАБОЧЫЯ ЎСЯГО СЬВЕТУ, УСЕ ПАД СЬЦЯГ КАМІНТЭРНУ

Мы, члены саюзаў м. Бярэзіна, заслухаўшы даклад аб Бэрлінскіх падзеях, кляймім ганьбаю сацыял-здрадніка ў—віноўніка крывавых растрэлаў рабочых дэманстрацый Бэрліну.

Мы шлем сваё гарачае братэрскае прывітаньне працоўным Бэрліну і іншых капіталістычных краін.

Прэч заліўшых крывёю рабочых вуліцы Бэрліну сацыял-дэмакратаў!

Прэч Цэргібэляўскі тэрор.

Рэвалюцыйны пралетарыят Нямеччыны і ўсяго сьвету—ўсе пад сьцяг Камінтэрну.

Няхай жыве саюз Чырвоных франтавікоў!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

У знак салідарнасьці адлічнаем аднадзённы заработак на карысьць сем'яў забітых, параненых і арыштаваных рэвалюцыйных пралетараў Нямеччыны.

* * *

Рабочыя і служачыя стан. Дрысы МБВ чыгункі супольна з працоўным сялянствам ваколічных вёсак пратэсту супроць зьверскага растрэлу Цэргібэляўскімі малайцамі мірнай рабочай дэманстрацыі ў Бэрліне і шлюць братэрскае прывітаньне гэраічнаму пралетарыяту Нямеччыны.

ЗАКЛІКАЮЦЬ АБ'ЯДНАЦЦА ВАКОЛ КАМПАРТЫІ

Агульны сход рабочых і служачых заводу «Красная Заря», заслухаўшы даклад аб крывавай расправе сац. фашыстых над рабочымі Бэрліну ў часе пэрамайскіх сьвят, кляймім ганьбаю здраднікаў рабочае клясы, верных псоў і катаў нямецкай буржуазіі—сацыял-дэмакратаў.

Сход адзначае, што растрэлямі рабочых дэманстрацый у Бэрліне сацыял-дэмакратыя паказала пралетарыяту усяго сьвету супроць каго і за каго яна змагаецца.

Мы шлем гарачае братэрскае прывітаньне нямецкім пралетарам і ўпэўнены, што ніякі тэрор ня спыніць волю пралетарыяту да барацьбы за вызваленьне з-пад ярма капіталу.

Прэч сацыял-дэмакратычных жандараў—Цэргібэляў!

Прэч здраднікаў рабочых інтарэсаў сацыял-дэмакратаў!

Мы заклікаем усіх рабочых Нямеччыны, якія яшчэ не парвалі з сацыял-дэмакратыяй, пакінуць гэтае бандыцкае гняздо і аб'яднацца вакол адзінага абаронцы інтарэсаў пралетарыяту—кампартыі Нямеччыны.

Няхай жыве адзінства пралетарыяту ва ўсім сьвеце!

Няхай жыве гэраічны нямецкі пралетарыят!

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік.

* * *

Рабочыя першай друкарні падымаюць свой рашучы голас пратэсту супроць крываваў расправы нямецкіх сацыял-фашыстых над пралетарыятам Бэрліну і кляймяць ганьбаю дзеячоў з II Інтэрнацыяналу.

МЫ ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ АКАЗАЦЬ ВАМ ДАПАМОГУ

Агульны сход калектыву служачых АВК, Акрвыканкому і Статбюро шле свае шчырае прывітаньне нямецкім рабочым і далучае свой голас пратэсту супроць белага тэрору у Нямеччыне над рэвалюцыйнымі рабочымі, якія выйшлі на вуліцу у дзень першага мая для дэманстрацыі сваей клясавай салідарнасьці з рэвалюцыйнымі масамі усяго сьвету і супроць падрыхтоўкі новае бойні.

У адказ на растрэлы рабочых дэманстрацый у Нямеччыне мы заклікаем пралетарыят усяго сьвету да яшчэ большае згуртаванасьці пад чырвоным сьцягам Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

У вашай барацьбе з буржуазіяй і сацыял-паліцэйскімі, мы заўсёды гатовы аказаць вам дапамогу. У знак салідарнасьці з нямецкім пралетарыям, агульны сход пастанаўляе адлічыць 1% ад месячнага заробку служачых на дапамогу ахвярам бэрлінскіх падзей.

Укосяць і выклікаюць

Калектыў супрацоўнікаў ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ пастанавіў адлічыць 1 проц. месячнай зарплаты (110 р.) у карысьць ахвяр сацыял-забойцаў у Бэрліне і выклікае ўсіх супрацоўнікаў акругкомаў і райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ і групкомы і мясцкомы прафсаюзу працасьветы.

ЗАКЛІК ПЛЕНУМУ ЦК САЮЗУ ХАРЧАВІКОЎ

МАСКВА, 17. Пленум ЦК Саюзу харчавікоў зьвярнуўся да ўсіх членаў саюзу з заклікам адпрацаваць 2 гадзіны ў карысьць сямей растрэляных і выкінутых на вуліцу рэвалюцыйных рабочых Бэрліну. (ТАСС).

С.-д. адобрыла крывавую дзейнасьць Цэргібэля

БЭРЛІН, 15. Сход службовых асоб бэрлінскай арганізацыі с.-д. партыі, які адбыўся на днёх, пераважная большасьцю галасоў адобрыў дзеяньні Цэргібэля ў першамайскія дні. (ТАСС).

Дэманстрацыя чырвонага збору ў Сярэд. Нямеччыне.

БЭРЛІН, 17. Акруговы камітэт КПН у Гале-Мэрзэбургу наладжвае 19-га мая ў 10-ці гарадох акругі дэманстрацыю чырвонага збору пралетарыяту ў Сярэдняй Нямеччыне. (ТАСС).

Афёра Гржэзінскага ў Прускім ляндтагу

БЭРЛІН, 14. Тэлеграфнае агэнцтва Вольфа і Бэрлінскі друк, перадаючы справаздачу аб выступленьні міністра ўнутраных спраў Прусіі Гржэзінскага на ўчарашнім пасяджэньні прускага ляндтагу, падае, што ў пацьвярджэньне «віны» камуністых за першамайскія падзеі, Гржэзінскі агаласіў прывітальную тэлеграму, пасланую ў Бэрлін ЦК УсеКП(б). (ТАСС).

ЗАЎВАГА ТАСС: Па наведзеных ТАСС'ам спраўках высьвятлілася, што **ніякай тэлеграмы ЦК УсеКП(б) у Бэрлін не пасылаў, і што міністар унутраных спраў Прусіі Гржэзінскі «аферировал» у ляндтагу тэлеграмай пасланай цэнтральным камітэтам саюзу мэталістыс за подпісам старшыні ЦК саюзу т. Лепсэ.**

Падпісаны савецка-эстонскі гандлёвы дагавор

РЭВЭЛЬ, 17. Сёньня ў прысутнасьці эстонскага міністра замежных спраў Ліціка падпісан гандлёвы дагавор паміж СССР і Эстоніяй. (ТАСС).

МАКСЫМУМ ЭНЭРГІІ ВЫКАНАНЬНЮ ВАЖНЕЙШАЙ ДЫРЭКТЫВЫ

Барацьба за сабекошт у бягучым годзе, перамогі і паражэньні на гэтым вучастку фронту будуць у той, або іншай ступені адбівацца на ўсіх вучастках сацыялістычнай рэканструкцыі гаспадаркі, якая праводзіцца партыяй. **Пасьпяховасьць выкананьня пляну будзе найбольш востраю зброяй у барацьбе за генэральную лінію партыі.** Фактычныя даныя, апублікаваныя на апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ВСНГ СССР, сьведчаць аб тым, што за першае паўгодзьдзе бягучага году заданьне па зніжэньні сабекошту выканана менш чым напалову. Наступныя два месяцы студзень і люты значных зьмен ня ўнесьлі і толькі ў сакавіку намецілася некаторае палепшаньне, якое працягваецца і ў красавіку. Гэта, зразумела зьяўляецца ў поўнай меры станоўчым фактам, але рашучым пераломам яго назваць нельга.

Прычынны такога становішча рэчаў трэба шукаць як у арганізацыі працы, так і ў тэхнічным кіраўніцтве вытворчым працэсам у цэлым. Пры лепшай арганізацыі сіл і пры іншым больш поўным скарыстаньні наяўнай матар'яльна-тэхнічнай базы мы маглі-б атрымаць больш высокія вынікі работы прамысловасьці. З прычыны налічча лішняй рабочай сілы, няправільнага яе скарыстаньня і цякучасьці, падзеньня працоўнай дысцыпліны і г. д. — прадукцыйнасьць працы за 4 месяцы ўзрасла ўсяго на 10,1 проц. замест плянавых 17 проц., пры росьце зарплаты, які амаль адпавядае плянаваму сярэдня-гадавому. У паасобных іншых галінах справа абстаіць яшчэ горш.

Месячная выпрацоўка па мэталюргіі недавыконана на 13,3 проц, пры 100% выкананьні па зарплаце; па каменнавугальнай недавыкананьне на праадпрацоўцы за першы квартал—9,7 проц., а па зарплаце ўсяго 2 проц. і г. д. Асабліва недавальняючае становішча на Донвугалі. Усе дэфэкты работы 2-га паўгодзьдзя 1927-28 г. правандравалі ў першы квартал бягучага году. Усё гэта гаворыць аб тым, што нашы прафэсыянальныя арганізацыі не досыць здавальняюча спраўляюцца з разьмеркаваньнем лішніх рабочых на прадпрыемствах, што яны мала ўдяляюць увагі задачы ўзьняцьця якасьці працы шляхам скарыстаньня актыўнасьці рабочых мас, што яны часам бюракратычна падыходзяць да задач сацыялістычнага перавыхаваньня ўноў уцягваемых у вытворчасьць неабвучаных рабочых і да барацьбы з падзеньнем працоўнай дысцыпліны сярод гэтых праслоек.

З другога боку гаспадарнікі нявыстарчальна ўсьвядомілі тое, што 1928-29 год зьяўляецца першым годам ажыцьцяўленьня «пляну вялікіх работ». Трэба таму прызнаць зусім правільным вывад, зроблены прэзыдыумам ВСНГ.

«Новы рэканструкцыйны этап, у якім мы з такім значным тэмпам праводзім перабудову прамысловасьці, патрабуе зусім іншае ўвагі да праблемы якасных каэфіцыэнтаў. Ва ўсёй шырыні і вострасьці, высоўваецца праблема пераварэньня галоўных кіраўніцтваў і трэстаў у штабы тэхнічнай палітыкі, якія ў поўнай меры адпавядалі-бы новаму этапу сацыялістычнай рэканструкцыі».

Гэты вывад тым больш правільны, што рэканструкцыя праводзіцца ва ўмовах вялізарнага росту актыўнасьці шырокіх пралетарскіх мас, ва ўмовах разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва, якія стараюць новую вытворчую абстаноўку. Па сутнасьці ўжо на нашых варштатах ствараецца тып новага рабочага, рабочага-актывістага, які перабудоўвае сваю работу на больш высокія тэмпы, скарыстоўваючы перавагі тэхнічнага ўзбраеньня працы, якое зараз значна вышэйшае, чым у мінулыя гады. Тут на дапамогу ўзрастаючай культуры пралетарскае працы павінна прыйсьці культура тэхнікі. **Партыйныя арганізацыі не павінны ні на водную хвіліну паслабляць кіраўніцтва і настойлівасьць у арганізацыі сіл рабочае клясы для барацьбы за зьніжэньні сабекошту.** Прафэсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі павінна ўмела рэалізаваць уздым творчых сіл і дабіцца зьніжэньня сабекошту ў бягучым годзе на патрэбныя 7 проц. (Правда).

Апошнія маскоўскія навіны

(Ад нашага карэспандэнта)

Першы савецкі дырыжабль

Намесьнік старшыні Рэвваенсавету СССР т. С. С. Каменеў паведаміў нашаму карэспандэнту, што ў Маскве пачалі пабудову першага савецкага дырыжаблю. Работы будуць скончаны ў верасьні, калі і адбудуцца пробныя палёты. Значную частку сродкаў на пабудову дала савецкая грамадзкасьць. У складаньні чарцяжоў прымаюць удзел інжынэры ЦАГІ. Савецкі дырыжабль будуецца з вучотам апошніх дасягненьняў эўрапэйскай тэхнікі. Ён будзе радыёфікаваны. Зразумела, ён на многі меншы за нямецкія і амэрыканскія дырыжаблі-гіганты, але, прымаючы пад увагу, што гэта першы камень у фундамант савецкага дырыжабля-будаўніцтва трэба прызнаць пабудову справай вялікай важнасьці.

На савецка-аўганскай граніцы спакойна

Басмачом дадзены належны адпор

ДЗЮШАНДЭ, 17. Па дадатковых даных шайка Макоула Фузайлі, уцякаючы ад прасьледваньня чырвоных часьцей мела значныя страты забітымі і параненымі і страціла амаль увесь конскі склад. (ТАСС).

*

ТАШКЭНТ, 17. Прыбыўшы з Мэрва камісар Н-скай кавалерыйскай брыгады Крапачоў заявіў, што на Кушкінскім вучастку савецка-аўганскай граніцы спакойна. Спроба невялікай басмацкай шайкі перайсьці граніцу была адбіта пагранічнай вартай. Насельніцтва настроена варожа да басмачоў. Дэхканства ахоўвае поўны супакой і працуе ў полі. Пасеўная кампанія ў некаторых раёнах скончана, у другіх—заканчваецца. У часе пасеўкампаніі чырвонаармейскія часьці аказалі дэхканам вялікую дапамогу. Дэхкане ў знак падзякі прадаставляюць харч, фураж і памяшканьне для чырвонаармейцаў. (ТАСС).

Арганізацыя сьвідравальных работ на Урале

МАСКВА, 17. «Главгортоп» даручыў Грознафце арганізаваць сьвідравальныя работы на Урале. Паводле пастановы прэзыдыуму ВСНГ СССР неабходна тэрмінова прыступіць да сьвідраваньня 5-ці новых скважын. Партыі, якія будуць весьці сьвідраваньне, неабходна склясьці з высока-кваліфікаваных рабочых і вопытных кіраўнікоў. «Главгортоп» просіць навукова-тэхнічны савет нафтавай прамысловасьці безадкладна заняцца распрацоўкай праблемы нафты на Урале. Савет павінен намеціць шырокі плян разьведак для пошукаў новых месцанараджэньняў нафты на заходняй частцы Уралу. Да работы трэба прыцягнуць буйн

Пастанова Інтэрнацыянальнай Кантрольнай Камісіі Камінтэрну

па справе А. Шумскага і К. Максімовіча

Па пастанове палітсэкратарыяту Выканкому Камінтэрну была створана камісія з членаў ІКК і ЦКК УсеКП(б) для разгляду пытаньня аб сувязі т. т. А. Шумскага і К. Максімовіча з антыкамуністычнай групай Васількова-Туранскага, якая адкалолася ў пачатку 1928 году ад КП Заходняй Украіны і зараз працуе на карысьць польскага фашызму. Гэта група Васількова-Туранскага сваімі ідэёвымі правадырамі лічыць Шумскага і Максімовіча, нацыяналістычны ўхіл якіх асуджаны як ЦК КП(б) Украіны, так і палітсакратарыятам Выканкому Камінтэрну (яшчэ ў верасьні 1927 г.).

Камісія ІКК і ЦКК УсеКП(б) дапытала Шумскага і Максімовіча і запрапанавала ім бязумоўна адмежавацца ад групы Васількова-Туранскага і катэгарычна асудзіць гэтую антыкамуністычную групу.

Шумскі і Максімовіч у красавіку месяцы падпісалі заяву з асуджэньнем групы Васількова-Туранскага, але камісія ІКК і ЦКК УсеКП(б) не магла прызнаць гэту заяву здавальняючай. У заяве нічога не гаворыцца аб правільнасьці лініі ЦК КП(б) Украіны па нацыянальным пытаньні, пацьверджанай пастановаю палітсакратарыяту Выканкому Камінтэрну ад верасьня 1927 г., але супроць якой пярэчыла група Васількова-Туранскага. Праўда, у другой сваёй заяве ад 18 сакавіка 1929 г. (таксама зусім нездавальняючай) яны і прызналі, што ня прытрымліваюцца іншых поглядаў, акрамя тых, якія выражаны ў пастановах КП(б)У.

У сваёй заяве Шумскі і Максімовіч тавараць, што «над імі вісела апошнія два гады цяжкое незаслужанае абвінавачаньне ў нацыяналістычным ухіле». Па гэтым пытаньні палітсакратарыят Выканкому Камінтэрну ў сваёй пастанове ад верасьня 1927 г. гаворыць: «Варожыя пралетарыяту погляды на вырашэньне нацыянальнага пытаньня знайшлі свой водгук сярод некаторых членаў КП(б)У (Шумскі, Хвылёвы), а ў далейшым аформіліся ў КП(б)У у выглядзе нацыяналістычнага ўхілу».

Правільнасьць гэтай ацэнкі поглядаў Шумскага ў нацыянальным пытаньні пацьвердзілі і сам Шумскі і Максімовіч у камісіі ІКК і ЦКК УсеКП(б), дзе яны фактычна выступалі ў абарону нацыяналістычнай, антыкамуністычнай групы Васількова-Туранскага і абвінавачвалі КПП і членаў КПЗУ, якія стаяць на пляцформе Камінтэрну, у расколе КП Зах. Украіны.

Далей Шумскі і Максімовіч у сваім заключэньні ідзьмуць сьцьвярджаюць, што нібы камісія ІКК і ЦКК УсеКП(б) прызнала, што ў іх **ня было і няма** разыходжаньняў з лініяй КП(б)У у нацыянальным пытаньні, а тым самым быццам ануляванa пастанова палітсакратарыяту Выканкому Камінтэрну ад верасьня 1927 г. Сапраўды-ж камісія толькі прыняла да ведама заяву Шумскага і Максімовіча аб тым, што ў даны час у іх **няма** разыходжаньня з лініяй КП(б)У.

Не пажадаўшы бязумоўна адмежавацца і асудзіць групу Васількова-Туранскага і абумовіўшы сваё асуджэньне патрабаваньнем зьняцьця з яго абвінавачаньня ў нацыяналістычным ухіле, Шумскі толькі пацьвердзіў факт, што і ў даны час ён яшчэ ня вызваліўся ад гэтага ўхілу. І наогул, на пасяджэньні камісіі ІКК і ЦКК УсеКП(б) Шумскі не праявіў неабходнай для партыйца шчырасьці ў прызнаньні сваіх памылак.

За пажаданьне бязумоўна асудзіць антыкамуністычную групу Васількова-Туранскага камісія ІКК і ЦКК УсеКП(б) пастанавіла абвясьціць т. Шумскаму **строгую вымову з папярэджаньнем.**

Што-ж датычыць Максімовіча, дык у працэсе работы камісіі высьветлілася, што Максімовіч з аднаго боку ўмоўна асуджае групу Васількова-Туранскага, а з другога боку падтрымліваe з ёю сувязь палітычнага характару. З прычыны гэтага камісія выказалася **за выключэньне Максімовіча з Камінтэрну, як падтрымліваючага сувязь з антыкамуністычнай групай, якая працуе на карысьць польскага фашызму.**

Адначасова, каб паказаць «падвойную бухгальтэрыю» Шумскага і Максімовіча, камісія пастанавіла апублікаваць заяву іх ад красавіка (без дакладнай даты) 1929 году.

ІКК на пасяджэньні ад 29 красавіка **1929 г. пацьвердзіла пастанову камісіі ІКК і ЦКК УсеКП(б) па справе Шумскага і Максімовіча.**

Сакратар ІКК З. АНГАРЭЦІС.

* * *

У рэдакцыю «Правды».

Просім апублікаваць гэту заяву.

Нашы адносіны да расколу ў камуністычнай партыі Заходняй Украіны і да групы Васількова-Туранскага, якая адкалолася ад Камінтэрну, ня былі вядомы да гэтага часу шырокім колам партыйнай грамадзкасьці. Хаця ў тых таварышоў, якія ведаюць нас і нашу партыйную дзейнасьць, не магло быць сумненьняў аб нашай пазыцыі ў гэтым пытаньні, аднак, мы лічым неабходным заявіць наступнае:

1. Мы рашуча і безагаворачна асуджаем раскол КПЗУ і ня можам інакш кваліфікаваць палітычныя паводзіны групы Васількова-Туранскага як ня толькі арганізацыйны, але і ідэёвы разрыў з Камінтэрнам, здраду прынцыпам камунізму і спаўзаньне на пазыцыю дробна-буржуазнага нацыяналізму.

2. Мы лічым злачынствам супроць Камінтэрну і здрадніцтвам інтарэсам рабочае клясы выступленьне групы Васількова-Туранскага з уласным сьпісам на выбарах у сойм, што аб'ектыўна зьявілася простай паслугай пілсудчыне.

3. Мы лічым палітычна фальшывай дэклярацыю групы Васількова-Туранскага аб роспуску сваёй арганізацыі, бо выглядны роспуск арганізацыі пры абароне асуджаных Камінтэрнам поглядаў пры захаваньні за сабой трыбуны сойму і арганізацыйных пазыцый у Сельробе, ня можа азначаць нічога іншага, як кансьпірацыю ад Камінтэрну і працяг барацьбы з ім пад псэўданімам.

4. Мы рашуча пратэстуем супроць скарыстаньня групай Васількова-Туранскага нашых партыйных імён у апраўданьне сваіх падводзін. Над намі вісела апошнія два гады цяжкое незаслужанае і няправільнае абвінавачаньне ў нацыяналістычным ухіле, хаця мы не разыходзіліся і не разыходзімся з лініяй КП(б)У у нацыянальным пытаньні, што і прызнана спэцыяльнай камісіяй вышэйшых інстанцый УсеКП(б) і Камінтэрну. Вось чаму мы адхіляем спробы раскольнікаў прыкрывацца нашымі іменамі і, тым больш, пропіпастаўляць нас ЦК КП(б)У.

5. Мы лічым абавязкам кожнага камуністага, рабочага і селяніна Заходняй Украіны выкрыцьцё раскольнікаў і яшчэ большае згуртаваньне вакол КПЗУ і яе ЦК, што кіруецца Камінтэрнам, у барацьбе за камунізм.

З камуністычным прывітаньнем

А. Шумскі.
К. Максімовіч.

***

МЕНСК БУДУЕЦЦА

Трамвайныя работы на Барысаўскім тракце

На палёх Беларусі

Не хапае бульбы і ячменю

ПОЛАЦК (наш кар.). Сяўба ў Полацкай акрузе праходзіць здавальняюча. Насеньнем аўсу округа задаволена звыш плану. Горш абстаіць справа з завозам насеньня бульбы і ячменю. Ячменем округа пакуль што задаволена на 50 процантаў, а бульбай—на 30 проц. Больш-менш добра з завозам канюшыны, заяўкі на якую ўжо задавольваюцца.

Мінэральных угнаеньняў не хапае, усе ільнаводныя раёны ўгнаеньнем забясьпечаны. Ільнянога семя ёсьць з лішкам. Кантрактацыя тэхкультур ільну і канюшыны—праходзіць пасьпяхова. Лён кантрактацыяй ужо амаль закончаны. Намечаныя да арганізацыі 40 калгасаў, арганізавана 66. У сучасны момант арганізацыя калгасаў працягваецца і ёсьць вынікі. У раней арганізаваных калгасах прыступлена да зямляўпарадкаваньня работ. На работу ў першую чаргу па гэтай галіне накіроўваюцца 38 чалавек студэнтаў, практыкантаў Горацкай с.-г. акадэміі. Акрэа ў дапамогу асобным саўгасам і калектывам накіравала тры трактары.

Сяўба ў калгасах і саўгасах праходзіць з уздымам.

Л.

У баку ад сацыялістычнага спаборніцтва

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Веснавая сяўба ў разгары. Сялянства большасьці населіч забясьпечана насеўным матар'ялам. У асобных раёнах крэдытныя таварыствы з вялікім спазьненьнем раздалі насельніцтву насенны матар'ял. У некаторых раёнах у рамонтных майстэрнях адчуваецца недахват патрэбных гатункаў насеньня, што адбіваецца на рамонце с.-г. інвэнтару. Спаборніцтва паміж калгасамі і саўгасамі разгортваецца вельмі павольна. Месцы чакаюць дырэктыў з цэнтру. З калгасаў пакуль што ў спаборніцтва ўступіў калгас «Дружба». Калгас ставіць задачай папырыць пасеўную плошчу на 8 проц. за кошт няўдобных зямель, павысіць ураджайнасьць на 12 проц., павысіць прадукцыйнасьць працы на 10 проц., арганізаваць ясьлі і г. д. Калгас выклікаў на спаборніцтва калгас «Дняпроўскую камуну», с.-г. арцель «Першамай» і камуну імя Карла Маркса.

Саюз с.-г. рабочых стаіць у баку ад спаборніцтва.

Еф—ў.

Зямляўпарадкаваньне яўрэйскага насельніцтва

ВОРША. (Наш кар.). Плян зямляўпарадкаваньня і перасяленьня яўрэйскага насельніцтва па Аршанскай акрузе за 1927-28 г. выкананы поўнасьцю. На выдзеленых 415 гэк. зямлі арганізавана: 1 сельска-гаспадарчая арцель і 9 садова-агародных таварыстваў; 76 гэкт. прырэзана да ўжо існуючых калгасаў, у Мсьціслаўскім раёне вызначана плошча для арганізацыі новага калгасу. Ва ўжо існуючыя калгасы і садова-агародныя арцелі ўцягнута 78 сем'яў. У Біра-Біджан пераселены 43 сям'і.

Але не абыйшлося і без цяганіны. Напрыклад, адвод вучастку зямлі арцелі «Чырвоная Ніва» ў Крупскім раёне ўжо цягнецца тры гады і дагэтуль яшчэ ня скончаны. Такія-ж выпадкі мелі месца і пры афармленьні арганізаваных калгасаў і арцеляй.

Акрвыканком прапанаваў усім райвыканкомам скончыць справы па арганізацыі і афармленьні яўрэйскіх калгасаў і арцеляй. Крупскаму ВВК прапанавана скончыць справу з перадачай зямлі арцелі «Чырвоная Ніва», а віноватых у цяганіне прыцягнуць да адказнасьці.

А. М.

БУДЗЬЦЕ БАЯВЫМІ АРГАНІЗАТАРАМІ МАС

МЕНШ АГІТАЦЫЙНАЙ ТРАСКАТНІ, БОЛЬШ ЖЫВЫХ ПРЫКЛАДАЎ НАШАГА БУДАЎНІЦТВА

„Чырвонае Шыла" ня востра коле

Мы заўсёды будзем патрабаваць ад насьценгазэты, няхай яна друкаваная, ці рукапісная, каб яна была **канкрэтнай**. Насьценгазэта ставіць перад сабой дзьве задачы: узьнімаць палітычна-культурнага ўзроўню рабочых і паляпшэньне пытворчасьці. Навакол гэтых задач і будуецца работа заводзкай газэты. Заметкі павінны біць фактамі па вытворчых недахватах, па культурнай і палітычнай адсталасьці таго ці іншага таварыша. Заметка б'е па недахопе, але разам з тым павінна **канкрэтна** паказваць, як недахоп вынішчыць.

Перад намі друкаваная газэта 1-ай друкарні ВДВ «Чырвонае шыла». Паглядзім, наколькі яна прытрымліваецца такой установкі.

На чатырох старонках газэты зьмешчана заметак, артыкулаў і фэльетонаў 39 шт., плюс—паштовая скрынка, паведамленьні, абвесткі і аддзел выклікаў збору сродкаў на самалёт «Рабселькор» і таш імя Ульянавай.

Ц аб якасьці заметак і артыкулаў.

Першая старонка прысьвечана перавыбарам бюро ячэйкі КП(б)Б. У версе аншляг: «Работу бюро ячэйкі КП(б)Б пад абстрэл рабочай самакрытыкі». Але рэдкалегія ня здолела арганізаваць сапраўднага абстрэлу работы бюро канкрэтнымі фактамі недахопаў і дасягненьняў. Замест канкрэтнага—агульныя разважаньні. У заметцы «аб недахопах у працы» аўтар кажа, што ў рабоце ячэйкі маюцца значныя дасягненьні, ёсьць і недахопы. Але ня прыводзіць ніводнага прыкладу дасягненьняў, а недахопы пералічвае шаблённа: мала масавасьці, мала сходаў (мала сходаў яшчэ не недахоп), не вядзецца падрыхтоўкі,... Словам, прыводзіць усё «перажованае». Гаворыць, што адзін партыец перагружаны, а хто канкрэтна—невядома. Аўтар у канцы заметкі піша ня горш, як у «Правде»: «У сувязі з чысткай партыі трэба праводзіць сыстэматычную і штодзённую работу па ўцягненьні лепшых рабочых у партыю». А каб аўтар замест гэтага агульнага сказаў-бы, што такія і такія (прозьвішчы) таварышы дастойны быць у партыі і задача дня—зрабіць іх членамі нашае ячэйкі... Гэта прынесла-б больш карысьці справе і газэце.

Прачытаўшы заметку—«Партработа ў пераплётнай»—ня будзеш ведаць, што там за «партработа». Напрыклад: «... партгрупа праводзіць у жыцьцё ўсе мерапрыемствы партыі па пытаньнях: кіраўніцтва гаспадарчым **становішчам** прадпрыемства». Папершае, нялісьменнасьць. Як можна «кіраваць становішчам»?, а па другое—дазвольце вам не паверыць, што вы «праводзіце ў жыцьцё ўсе мерапрыемствы партыі», бо вы не даяце ў заметцы ніводнага прыкладу, які сьведчыў-бы, што вы **«правялі ў жыцьцё»**.

У тэй-жа заметцы аўтар запэўніваецца, што павялічылася актыўнасьць рабочых на вытворчых нарадах, што «мы маем рад практычных прапаноў, як лепш паставіць працу пераплётнай». Лепш было-б, каб вы паказалі хоць-бы на адну прапанову рабочага, якая ўжо праведзена ў жыцьцё і якую карысьць прынесла, а то чытач ня ведае, што гэта за прапановы?

Такой-жа якасьці і астатнія заметкі партаддзелу: пустаслоўе і агітацыя.

З аддзелам сацыялістычнага спаборніцтва яшчэ горш: там адзін выклік т. Гэльфанда і дзьве пустыя агітзаметкі. Тав. Шэмпэль у заметцы «Хто першы» паведамляе, што спаборніцтва ўсё больш ахапляе фабрыкі і заводы ўсяго Савецкага Саюзу і пытае: «ці нельга і нам уліцца ў гэту вялічэзную **сацыялістычную хвалю** спаборніцтва!». І адказвае: «Так, можна... патрэбен толькі пачатак.... Хто першы?»—заканчвае ён. Тав. Шэмпэль, вы лепш-бы зрабілі, калі-б замест пустаслоўя і цытаньня «хто першы» адгукнуліся на выклік т. Гэльфанда і такім чынам **былі-б другім**.

Ёсьць заметкі, як, напрыклад: «Мяккацелы Левін» і «Защитник наизнанку», якіх адразу не зразумееш, а трэба некалькі раз прачытаць і ўсё-ж такі... не зразумееш.

Артыкул «нашы задачы» і фэльетон «Усё з-за дарагіх яек» па сваёй форме і зьмесьце непатрэбныя і нават шкодныя. Такія думкі (у двукосьсях) як «не надо вмешиваться в чужие дела», прыцягнуты за валасы самім тав. Гобэрманам, бо ён не паказвае, хто гэта «гаворыць». У сваім артыкуле, ён увесь час гаворыць не ад імя свае ячэйкі, а ад імя партыі. Аўтар, між іншым, кажа: «задача партыі на сёнешні дзень—50 проц. рабочых **у партыю»**. Гэта няправільная ўстаноўка. Партыя ня ставіць сёньня перад сабой задачу ўцягнуць у партыю 50 проц. рабочых. Гэта немагчыма, а задача стаіць дабіцца, каб партыя **складалася на 50 проц.** з рабочых ад варштату.

Да недахопаў трэба аднесьці і малюнак «пралетарская мясарэзка». Тут рэдкалегія перастаралася. З жахам глядзіш на гэты малюнак і думаеш: няўжо там жывадзёры горш палача Цанкова. На Цанкова прыемней глядзець, як на ваш малюнак, пад якім подпіс «пралетарская». Добра, што хоць у двукосьсі ўзялі «пралетарская».

К дасягненьням газэты можна аднесьці аддзел да чысткі савецкага апарату; там паказаны асобы, прыклады, факты і лічбы—тое, што трэба ў газэце. Добры пачын робіць газэта заметкай **«Ни одной заложанной облигации»**. Гэту кампанію трэба пашырыць.

Наша прапанова выпускаць газэту на дзьвёх старонках і часьцей. Пісаць заметкі больш кароткія і б'ючыя ў мэту канкрэтнымі фактамі. Таксама—перавесьці газэту на беларускую мову.

І—х.

„Цягнік", які ня рухаецца

Друкаваная газэта «Цягнік»—газэта чыгуначнікаў Полацкага вузла. Чытаючы гэту газэту, мімаволі трэба спытаць сябе, навошта яна выдаецца і для каго? Аб масавасьці газэты гаворыць тое, што выходзіць яна на дзьвёх старонках, з 20 заметак, зьмешчаных у газэце, можна пакінуць толькі 12, якія маюць значэньне для заводзкай друкаванай газэты.

Калі-ж возьмем пад увагу, што ў Полацку выдаецца друкаваная акруговая газэта «Чырвоная Полаччына», якая выходзіць 2 разы ў тыдзень на чатырох старонках, дык стане зразумелым, што на 6 заметак знойдзецца месца і ў «Чырвонай Полаччыне». Што-ж рабіць з іншымі артыкуламі? На гэта адказа зьмест артыкулаў. Напрыклад: 1) «Адозва XVI партканфэрэнцыі аб сацыялістычным спаборніцтве», 2) «Даклад Ярославскага аб чысткі партыі», 3) Падрыхтоўка да чысткі савецкага апарату ідзе дрэнна» (матар'ял РСІ); 4) «Антырэлігійная работа на полацкім чыгуначным вузлу» (справаздача, напісана па заданьні); 5) «Усе на барацьбу з бездарожжамі» (агульны заклік уступіць у члены Аўтадору); 6) «Чарговыя задачы рабкораў чыгуначнікаў». Падзагалоўкі гэтага артыкулу: «Пасьпяхова правесьці двухтыднёвік друку»; «За дзесяцітысячны тыраж «Чырвонай Полаччыны»; «Паступіць на завочныя карэспандэнцкія курсы»—гавораць, дзе артыкул павінен быць надрукаваны. Мы ня супроць гэтага артыкулу, але зьмяшчаць яго трэба не ў заводзкай друкаванай газэце, **а ў акруговай.** Усе паданыя артыкулы былі ўжо зьмешчаны ў цэнтральных газэтах і «заслуга» рэдкалегіі «Цягніка» толькі ў тым, што яна навучылася працаваць на чацьвёртым нумары газэты больш ножніцамі, чым арганізоўваць рабкораў.

Мы згодны з «Цягнікам», які піша ў адным артыкуле: «галоўнае, трэба згуртавацца вакол акруговай газэты «Чырвоная Полаччына». Гэта будзе больш карысна для «Чырвонай Полаччыны» і насьценгазэт Полацкага вузла.

М.

„Чырвоны Сьцяг" АБВШ

Асноўнай задачай вайсковых насьценгазэт зьяўляецца дапамагаць камскладу падняць баяздольнасьць Чырвонай армі. Адгэтуль вынікае, што самы маленькі факт паслабленьня дысцыпліны або заняткаў павінен зараз-жа арганізаваць вайскораў і насьценгазэту для барацьбы з гэтымі зьявішчамі. Вайсковыя насьценгазэты павінны таксама дапамагаць узмацніць сувязь вайсковых часьцей з грамадзкімі арганізацыямі, паказваючы шляхі, як гэта зрабіць.

А цяпер прагледзім газэту «Чырвоны сьцяг» АБВШ **(Аб'яднанай беларускай вайсковай школы).** Газэта шмат месца аддае рабоце грамадзкіх арганізацый. Шмат пішацца аб сувязі з падшэфнай вёскай. Не абмінула газэта і такіх пытаньняў, як чыстка партыі, узмацненьне дысцыпліны, барацьба з хуліганствам, безгаспадарчасьцю і г. д. Вельмі добра арганізаваны аддзел адказаў па заметкі. Можна сказаць напэўна, што гэты аддзел чытае кожны курсант.

Побач з агульнай карысьцю гэтага аддзелу, рэдкалегія павінна больш уважліва аднесьціся да падачы яго. Такія загалоўкі над кожным водгукам, як: «адказ на артыкул у «Чырвоным сьцягу»—губляюць некаторую долю цікаўнасьці чытача. Трэба даць такі загаловак, які-б гаварыў, аб чым ідзе справа.

Трэба параіць рэдкалегіі «Чырвонага Сьцягу» зьмяшчаць больш дзелавых заметак курсантаў. Такія заметкі, як «Час пачынаць працу», «Патрэбна гісторыя школы»—вельмі карысны.

Побач з удалай пастаноўкай некаторых пытаньняў, кідаецца ў вочы тое, што рэдкалегія некаторыя заметкі зьмяшчае, каб толькі запоўніць месца. Напрыклад, заметка «Задачы вайскораў школы» напісана вельмі непапулярна.

Невядома, чым вытлумачыць, што газэта завецца органам бюро калектыву КП(б)Б, а не газэтай курсантаў. Трэба ўсьвядоміць усім курсантам, што гэта іх калектыўная газэта, якую трэба скарыстоўваць, як сродак арганізацыі грамадзкай думкі.

М. Л.

МЕНСК БУДУЕЦЦА

Каналізацыйныя работы на ленінградзкай вулцы

Сацыялістычнае спаборніцтва

ХТО КАГО ВЫКЛІКАЕ

Рабочыя сталярна-мэблевай фабрыкі імя Халтурына (Віцебск) прынялі выклік рабочых фабрыкі гнутай мэблі «Масдрэва» і выклікаюць завод «Дрэваапрацоўшчык» (Менск). Умовы спаборніцтва—зьніжэньне сабекошту на 11 процантаў, падняцьце прадукцыйнасьці працы на 10 проц. (звыш намечанай праграме) і памяншэньне глуму на 6 проц.

Рабочыя кардоннай фабрыкі імя Леніна (Пухавічы) уступілі ў спаборніцтва і выклікалі кардонныя фабрыкі імя Сталіна і Вароўскага. Умовы спаборніцтва: павышэньне вытворчай праграмы на 25 проц., прадукцыйнасьці працы—на 30 проц., зьніжэньне сабекошту прадукцыі на 15 проц., памяншэньне выдатку балянсу на 11 проц., апалу—на 20 проц.

Рабочыя шпалернай фабрыкі імя Вароўскага прынялі выклік Добрускай фабрыкі паперы і выклікалі шпалерныя фабрыкі Масквы, Ленінграду і Адэсы. Умовы: зьнізіць сабекошт на 5 проц., процант глуму—да 0,15 проц. (цяпер 0,25).

Служачыя Магілеўскага акрфа прынялі выклік супрацоўнікаў Бабруйскага акрфа і выклікалі на спаборніцтва аршанскі акрфа.

Рабочыя Мазырскай фабрыкі «Прафінтэрн» выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва рабочых цэху ўнітазных сядзеньняў заводу «Камінтэрн». Умовы спаборніцтва—зьніжэньне сабекошту прадукцыі на 7 проц., выкананьне вытворчай праграмы на 110 проц. і падняцьце прадукцыйнасьці працы на 30 проц.

Калектыў Магілеўскага аддзяленьня Лесбелу выклікаў на спаборніцтва супрацоўнікаў Гомельскага аддзяленьня Лесбелу і Магілеўскага акрлесагу.

Нашы сады патрабуюць лепшага догляду

Сады пашкоджаны марозам

Сырая і працяжная восень, нябывалая халодная зіма з марозамі да 40 гр. і позьняя з вялікімі замарозкамі вясна, як і трэба было чакаць. стварылі выключна неспагаданыя ўмовы для нашага садаводзтва. З месц паступаюць весткі аб масавым пашкаджаньні пладовых садоў і часткова рассаднікаў ад марозаў. Папершае, наглядаецца масавае вымярзаньне пладовых пупышкаў на ўсіх пладовых пародах і гатунках за выключэньнем антонаўкі і некаторых больш трывалых зімовых гатункаў. Падругое, абмярзаньне сучча ня толькі аднагадовага ўзросту, але і больш старэйшага. Асабліва моцна пашкоджаны грушы і яблыні мала выносьлівых гатункаў. Назіраюцца выпадкі вымярзаньня амаль усяго дрэва. Хаця яшчэ поўнага малюнку пашкоджаньня садоў няма, але ўжо можна канстатаваць тыя вялікія страты, якія прычынены садоўніцтву. Адсюль, у зьвязку з такім нябывалым яшчэ для нашага садаўніцтва зьявішчам, нашы сады, апрача іншага догляду, патрабуюць неадкладнай і належнай працы на ліквідаваньні пашкоджаньняў ад марозаў. Трэба правесьці шырокую растлумачальную працу, дэманструючы абрэзку абмёрзлых частак дрэва.

Для правядзеньня гэтага мерапрыемства, апрача аграпрацаўнікоў земарганаў, неабходна ўцягнуць працаўнікоў саўгасаў, калгасаў, настаўніцтва, школы сялянскай моладзі. ЛКСМ, аграўпоўнаважных і ўвесь вясковы актыў.

Л. РАЎДО.

П. В. Румянцаў

НА ЗДЫМКУ: у авале—П. В. Румянцаў, унізе—дом, дзе адбываўся першы зьезд РСДРП (на кватэры Румянцава)

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). 15 мая ў г. Суражы, Віцебскае акругі памёр Пётр Васільевіч Румянцаў—адзін з старых рэвалюцыянэраў, на кватэры якога ў Менску ў 1898 г. адбыўся першы зьезд РСДРП.

* * *

Тав. Румянцаў П. В. нарадзіўся ў Маскве ў 1859 годзе. Вучыўся ў камэрцыйнай школе. Ліквідаваўшы ў старэйшым класе вучылішча ён арганізоўвае нелегальныя гурткі з вучняў старэйшых кляс. За рэвалюцыйную работу сярод сялян сяла Кімры, Цьвярской губ., Румянцаў трапляе ў турму. Пасьля доўгага прабываньня ў турме ён высылаецца на 3 гады ў Заходнюю Сібір.

Па адбыцьці пакаранья Румянцаў часова пасяляецца ў Цьвяры, дзе дапамагае арганізаваць падпольную друкарню. Пераехаўшы потым у Тыфліс, Румянцаў вядзе рэвалюцыйную работу сярод расійскай моладзі. На кансьпіраванай кватэры Румянцаву заўсёды знаходзілі прытулак рэвалюцыянэры.

Увесь свой заработак Румянцаў траціў на аказаньне дапамогі рэвалюцыянэрам.

З Тыфлісу праз некаторы час ён пераязджае ў Менск.

У 1898 годзе, пасьля таго, як на яго кватэры адбыўся першы зьезд РСДРП. Румянцава арыштоўваюць. Пасьля году адседжі ў турме, ён зноў працуе і дапамагае рэвалюцыянэрам.

Румянцаў быў сьвядомым марксыстым з пачатку «чорнаго перадзелу і ён адразу далучыўся да РСДРП. У пасьлякастрычнікавы пэрыяд Румянцаў з прычыны старасьці і хваравітага стану, адыйшоў ад актыўнай рэвалюцыйнай работы.

СІМОНЧЫК.

АБАВЯЗКОВА ПРАЧЫТАЙЦЕ № 7-8 - „Рабоче-Крестьянского Корреспондента"

Выйшаў з друку № 7—8 журналу «Рабоче - Крестьянский Корреспондент». **Зьмест нумару вельмі багаты і разнастойны.**

Якія-ж пытаньні ставіць перад сваім чытачом-рабселькорам «Рабоче-Крестьянский Корреспондент» у чарговым нумары?

Перш за ўсё пытаньне аб удзеле рабкораў і насьценных газэт **у сацыялістычным спаборніцтве.** У перадавіцы, прысьвечанай гэтаму пытаньню, «Рабоче-Крестьянский Корреспондент» падрабязна гаворыць аб задачах сацыялістычнага спаборніцтва і аб тым, што павінны рабіць рабкоры і насьценныя газэты па спаборніцтве. Далей ідзе артыкул Ільліча «Как организовать социалистическое соревнование?», агляд работы раду друкаваных заводзкіх газэт па сацыялістычным спаборніцтве, артыкул аб тым, як вядуць друкаваныя заводзкія газэты кампанію за працоўную дысцыпліну і, нарэшце, артыкул аб удзеле юнкораў і насьценных газэт моладзі ў сацыялістычным спаборніцтве.

Увесь гэты матар'ял паданы цікава, насычаны фактамі і прыкладамі і, зразумела, дасьць істотную дапамогу рабкорам і рэдкалегіям, якія, трэба сказаць, яшчэ не заняліся, як трэба, пытаньнямі сацыялістычнага спаборніцтва.

Артыкул—«Мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў—неадкладная задача»—растлумачвае мэту, сутнасьць і задачу мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і дае рад паказаньняў аб тым, як павінны падыходзіць да гэтага пытаньня рабкоры і насьценныя газэты і што яны павінны рабіць у бліжэйшы час.

Надзвычайна цікавы артыкул т. Інгулава «Чыстка партыі і задачы рабселькораў». Вялікую цікаўнасьць прадстаўляе таксама артыкул аб тым, каб насьценныя газэты падышлі бліжэй да сям'і рабочага, да рабочага быту («Об очередях, семье и газете»). Гэты артыкул, напэўна, выкліча шмат водгукаў з месц.

Вялікае месца, як і заўсёды, адводзіць «Рабоче-Крестьянский Корреспондент» пытаньням міжнароднай перакліччі. Далей ідзе рад артыкульчыкаў аб масавай рабоце насьценных газэт, артыкулы і заметкі аб ілжэ-рабкорах, аб прапрацоўцы вынікаў IV Усесаюзнай нарады рабселькораў, вялікая і рознастайная хроніка, літаратурны аддзел і г. д.

«Рабоче-Крестьянский Корреспондент» № 7—8 павінен мець кожны селькор, кожная рэдкалегія. Артыкулы, зьмешчаныя ў гэтым нумары, трэба ня толькі прачытаць, але і абавязкова **прапрацаваць на рэдкалегіях і на шырокіх сходах пішучых і чытачоў насьценных і друкаваных заводзкіх газэт.**

У прэзыдыуме менгарсавету

КВАТЭРНЫЯ ІЛЬГОТЫ МІЛІЦЫЯНЭРАМ. Прэзыдыум гарсавету прызнаў патрэбным, каб супрацоўнікам міліцыі была прадстаўлена 25 проц. скідка паводле існуючых ставак кватэрнай платы. Узбуджаецца хадайніцтва перад СНК БССР аб зацьвярджэньні гэтай пастановы. Камгасу даручана дагаварыцца з камісіяй Помдзет аб выданьні ў тэрміновым парадку брашуры і інструкцыі аб новых стаўках кватэрнай платы і парадку іх ужываньня.

НОВЫЯ ЯСЬЛІ. Наркампрацы адпусьціў 1.000 рублёў на адкрыцьцё ў Менску яслей для дзяцей жанчын адзінак, занятых на грамадзкіх работах. Гарсавет згадзіўся з адкрыцьцём гэтых ясьляў. Арганізуецца таксама дзіцячая пляцоўка.

«СПОРТ»

«Тыднёвік фізкультуры». У гор. Чэрвені 12 мая скончыўся «тыднёвік фізкультуры». «Тыднёвік» быў скарыстаны для шырокай папулярызацыі ідэй фізкультуры і ўцягненьня дарослага працоўнага насельніцтва ў фізкультурныя гурткі. Па саўгасах, калгасах і вёсках удалося арганізаваць 15 гурткоў фізкультурнікаў. У час «тыднёвіку» было праведзена 4 дармовых кіно-сэансы з дэманстраваньнем карціны аб фізкультуры. На сэансы прысутнічала каля 1.200 чалавек.

Спаборніцтва па цяжкай атлетыцы. Па саюзе будаўнікоў скончыліся спаборніцтвы па цяжкай атлетыцы і барбе. У спаборніцтвах удзельнічала 25 чалавек. Вынікі здавальняючыя.

Масавае гуляньне. 26-га мая ў садзе «Прафінтэрн» наладжваецца масавае гуляньне з фізкультурнымі гульнямі па футболе, баскетболе і волейболе. У гуляньні прыме удзел каля 5 тысяч чалавек. Будзе таксама наладжана фізкультурная інсцэніроўка.

Выйграў 1.000 рублёў

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Учора аддзяленьне Дзяржбанку выплаціла супрацоўніку 4-га вучастку службы пяці тав. Рабцаву выйгрыш у 1.000 руб. па аблігацыі 2-е пазыкі індустрыялізацыі. Выплата выйгрышаў працягваецца. На 16 студзеня банкі выплацілі па аблігацыях 2-й пазыкі індустрыялізацыі 20.604 руб. 50 кап.

Попыт па аблігацыі пазыкі працягваецца. Банкаўскія ўстановы прадалі аблігацый пазыкі 1929 г. на 75 тысяч рублёў і аблігацый 1-й пазыкі індустрыялізацыі на 105 тысяч рублёў. Учора ў Дзяржбанку былі праданы ўсе аблігацыі пазыкі індустрыялізацыі.

Новы этап у жыцьці беларускага выяўленчага мастацтва

Трэцяя ўсебеларуская мастацкая выстаўка зрабіла пэўны зрух грамадзкае думкі вакол мастацкага жыцьця. Водгукі ў беларускай прэсе і дыспут, які адбыўся пасьля выстаўкі, яскрава паказалі, што далейшае, ізаляванае ад грамадзкага і культурнага жыцьця існаваньне мастацтва немагчыма. Пры ранейшых умовах выяўленчае мастацтва БССР засуджана на адрыў ад беларускай глебы, ад палітычнага і культурнага жыцьця беларускіх рабочых і сялянскіх мас.

У той час, як іншыя галіны мастацтва—прыгожае пісьменства, тэатр, музыка—з кожным годам разьвіваліся ўсё буйней і зрабіліся неадымнай часткай культурнага жыцьця шырокіх мас, выяўленчае мастацтва расло і разьвівалася валіпне марудным тэмпам. Яшчэ дагэтуль выяўленчае мастацтва нізьвічайна мала папулярызавана ў масах.

Час ад часу, калі бывалі ўсебеларускія мастацкія выстаўкі, выяўленчае мастацтва як-бы абуджалася ад летаргічнага сну, дэманстравала перад шырокім грамадзтвам свае дасягненьні і трапляла ў арбіту грамадзкае ўвагі.

У пэрыяд паміж выстаўкамі зноў усе забывалі пёра існаваньне мастацтва, пра творчую працу мастакоў, пра тыя задачы, якія стаяць перад беларускім мастацтвам, і пра тыя шляхі, якімі павінна ісьці праца беларускіх мастацкіх сіл.

Наша выяўленчае мастацтва толькі тады здолее нармальна разьвівацца калі яго ролю і задачы зробяць папулярнымі ў масах, калі яно будзе зразумелым і даступным для гэтых мас.

Трэба стварыць вакол мастацкай дзейнасьці асабліву прыхільнасьць грамадзкай думкі. Знайсьці шляхі ды спосабы паказаць кожнаму рабочаму і селяніну, што малярства—гэта не забаўка, але адзін з магутных культурных сродкаў, які пры належным яго скарыстаньні актыўна дапамагае сацыялістычнаму будаўніцтву. Выяўленчае мастацтва ёсьць адзін з відаў клясавай пралетарскай зброі, якую трэба ўсямерна скарыстаць у барацьбе за новы быт, за новую сацыялістычную культуру, новую сацыялістычную гаспадарку.

Культурныя, грамадзкія і эканамічныя ўмовы, у якіх працуюць беларускія мастакі да гэтага часу мала спрыялі выяўленьню іх творчасьці. Адчувалася ўвесь час абыякасьць і бясцікаўнасьць з боку грамадзтва як да выяўленчага мастацтва, так і да шляхоў, якімі яно ідзе.

І вось лёд крануўся. Пасьля трэцяе выстаўкі ўтварэцца пры дзяржаўным музэі невялічкі гурток па вывучэньні мастацтва і адшуканьні спосабаў папулярызацыі яго ў масах. На працяту некалькіх месяцаў, пасьля раду дакладаў і дыскусій, аказалася, што рамкі гуртка заліпне малыя, каб разгарнуць побач з навуковай шырокую культурную работу. Трэба было выйсьці са словам пра мастацтва ў шырокія колы насельніцтва і пачаць плянавую прапагандысцкую работу ў рабочых клюбах, у тэхнікумах, школах, фабрыках, на вялікіх сходах і г. д.

І вось у суботу (18-V) у Доме Пісьменьніка адбыўся шырокі ўстаноўчы сход для ператварэньня гуртка ў «Беларускае таварыства прыхільнікаў выяўленчага мастацтва». Паводле праекту статуту таварыства, яго дзейнасьць іменна пойдзе шляхам ўцягненьня як мага шырэйшых мас у справу папулярызацыі мастацтва. Арганізацыя пры дапамозе Галоўмастацтва, культаддзелаў саюзаў масавых сыстэматычных дакладаў пра мастацтва і яго ролю, дэманстраваньне пры дапамозе дыяпазытываў рэпрадукцый з мастацкіх прац, выданьне масавых каляровых рэпрадукцый з малюнкаў лепшых мастакоў БССР і СССР, выпуск папулярнай літаратуры пра мастацтва, арганізацыя часовых карцінных галярэй і інш.—усё створыць спрыяючую атмасфэру для росквіту выяўленчага мастацтва.

І галоўнае—таварыства мабілізуе ўвагу вакол пытаньняў мастацтва і створыць вялізны актыў прыхільнікаў выяўленчага мастацтва. Бяз прыхільнай грамадзкай думкі, без пашырэньня ў масах мастацкіх твораў (рэпрадукцый) і без папулярызацыі ідэй мастацтва яно было-б і надалей засуджана на мадзеньне.

Арганізацыя «Беларускага таварыства прыхільнікаў выяўленчага мастацтва»—ёсьць буйны крок наперад у нашым мастацкім жыцьці. Бясспрэчна, гэта ёсьць новы этап, ад якога выяўленчае мастацтва БССР, падтрымане шырокай грамадзкай увагай і прыхільнасьцю, пачне жыць больш інтэнсыўна, больш сугучна з сучасным палітычным і культурным жыцьцём працоўных беларускіх мас.

І. ЦЬВІКЕВІЧ.

Каўкаскія мінэральныя воды як спосаб барацьбы з алкагалізмам і эпідэмічнымі захворваньнямі

Ужываньне Каўкаскіх мінэральных вод за апошнія гады сярод працоўных мас БССР робіцца паступова ўсё больш і больш папулярным, гэта відаць з наступных даных Менскага цэнтральнага складу: у 1924 г. было прадана 41.000 п/бутэлек, у 1925 г.—79000 п/бут., у 1926 г.—324.000 п/бут., у 1927 г.—500.000 п/бут. і у 1928 г.—550.000 п/бутэлек.

Аднак, ужываньне Каўкаскіх мінэральных вод у параўнаньні з колькасьцю выпітай за гэты-ж пэрыяд гарэлкі, віна, піва і г. д. зьяўляецца вельмі мізэрным.

Побач з прапагандай аб шкоднасьці ўжываньня сьпірытусовых напіткаў—спосабам у барацьбе з віном, гарэлкай зьяўляецца таксама прапаганда карысьнасьці ўжываньня мінэральных вод. Між тым у гэтым напрамку нічога ці амаль нічога ня зроблена і ня робіцца.

Калі дактары ў патрэбных выпадках рэкамэндуюць ужываньне лекавых мінэральных вод: «Эсэнтукі» № 4, 17, 18, баржомскую, баталінскую і інш. воды, дык сталовыя Каўкаскія мінэральныя воды—Нарзан і Эсэнтукі № 20 амаль зусім пакідаюцца бяз увагі. Гэта можна тлумачыць толькі недаацэнкай якасьці і значэньня іх.

Фальшывасьць погляду, што алькаголь становіча ўплывае на арганізм чалавека, цяпер ужо навукова даведзена.

Досьледы намецкіх вучоных Шмідэбэрга і Крэпэліна давялі, што ўплыў алкаголю нават пры невялікіх дозах выяўляецца ў паралюшы тых цэнтраў, якія зьяўляюцца органамі ўвагі і самакантролю. Гэта дапамагае злачынасьці, робіць чалавека пасьля першых чарак балбатлівым, занадта рухавым, выклікае ў ім нечаканыя звароты мысьлі, мовы і паводзін. Пры павялічэньні колькасьці выпітых сьпірытусовых напіткаў настае «аглушэньне» вышэйшых цэнтраў: трацілца сьвядомасьць учынкаў, пачуцьцё болю. Пасьля пахмелья--боль галавы, агульная ізолаасьць разьбітасьць, млоснасьць.

Зусім іншы, процілеглы ўплыў маюць на чалавека мінэральныя воды, у прыватнасьці Нарзан і Эсэнтукі № 20.

Ня кажучы ўжо аб тым, што, праганяючы омагу, яны асьвяжаюць і ўзвяршваюць, падымаюць настрой чалавека,—яны займаюць адно з першых месц пры нармальным працэсе отраўленьня і даюць добрыя вынікі пры захворваньнях отраўніка.

Нарзан, будучы багатым на вуглянаквасныя газы, узмацняе рух кішок і сэкрэторную дзейнасьць стрававальных залоз і сьлізаватых абалонак, павялічвае колькасьць мачы, памагае распусканьню фасфарытаў, а яго вуглянаквасныя солі дапамагаюць лепшаму распусканьню мачавой кіслаасьці і станоўча ўплываюць пры катаральных захворваньнях мачавых пуцей.

Эсэнтукі № 20 дапамагаюць правільнаму страўленьню, нішчаць цэлы шэраг дыспэптычных прыпадкаў: эдрыганьне, пакотку, млоснасьць і дапамагаюць правільнаму дзеяньню кішэчніка.

Эсэнтукі маюць яшчэ тую ўласьцівасьць, што пры ап'яненьні дапамагаюць выдзяленьню алькаголю з арганізму, чым хоць трохі памяншаюць шкоду ад алкаголю.

Эсэнтукі № 20, асабліва Нарзан, прыемныя на смак напіткі.

Важнае значэньне маюць Нарзан і Эсэнтукі № 20 і ў барацьбе з эпідэмічнымі хваробамі.

З тае прычыны, што яны крыху даражэй ад эльтарскай вады, квасу і ліманаду і што апошнія больш як-бы «омачныя», працоўныя масы больш ужываюць эльтарскую, квас і ліманад.

Між тым гэтыя штучныя напіткі, калі прынаць пад увагу становішча нашых вадаправодаў і тое, што гэтыя напіткі, не зважаючы на забарону, часта робяцца з сырой вады, яны ў параўнаньні з Нарзанам і Эсэнтукамі № 20, бязумоўна, зьяўляюцца шкоднымі, іх роля ў распаўюджаньні эпідэмічных захворваньняў зьяўляецца вядомай!

Зусім іншая справа--Каўкаскія мінэральныя воды.

Яны налівацца ў бутэлькі непасрэдна з горных крыніц з захоўваньнем усіх правіл санітарыі.

Пры гэтых умовах яны на могуць зьмяшчаць у сабе бактэрый, якія выклікаюць захворваньні.

Да рэчы тут будзе напомніць аб вядомым выпадку, які меў месца ў 1927 г. у Растове на Д. Калі там папоавуўся вадаправод, то ў мэтах барацьбы з эпідэміяй было шырока выкарыстана ўжываньне сталовых Каўкаскіх мінэральных вод.

**Усе захапляюцца

Бруно Ясенскі

„Я жгу Париж“ [1]

V.

Усё, што здарылася потым, тырчэла ўжо, як чаплінская халупка над бяздоньнем, адным бокам ва межамі трохмернай рэчаіснасьці.

Чорныя, пахмурыя сьцены. Правільны куб цёплага паветра, якое можна рэзаць нажом, як гіганцкі кубік чарадзейнага бульёну «Маггі». І ў глыбокім в кратамі калодзежы вакна—літар кандэнсаванага неба.

П'ер пазнаў новы сьвет, які кіруецца ўласнымі, асобнымі законамі на палёх вялікага складанага мэханізму сьвету. Незнаёмы сьвет рэчаў, якіх ня трэба вараблясь: нізкі ручны ложак пад полагам столі, раніцою і ўвечары місачка гарачай стравы з кавалкам хлеба. Побач, за сьцяной, у сумежных, цесных пакойчыках—дзіўнае зборышча людзей, выкінутых, як адкіды, дакладнай машынай сьвету сюды праз высокі плот бульвару Арато і па чыёйсьці невядомай волі зьвязаных, зьнітаваных у новы мэханізм, які кіруецца новымі, дзіўнымі законамі Міру Гатовых Рэчаў.

Мерныя, як карусель, бессансоўныя пагулянкі на сымэтрычных кругох двару, над нізкім, закапцелым каўпаком турэмнага неба. Доўгі, адностойны рад пацерак, што перасоўваюцца чыёйсьці нябачнай рукой, кожная касьцяшка якіх—жывы камок чалавечай істоты; мэханізм калёсікаў, якія не змаглі падыйсьці нікуды па той бок плоту; выкінутыя-ж сюды, у гэтую жахлівую кладоўню, яны дзіўна спалучаюцца адзін з адным, нечакана зазубрываюцца, ствараюць новы калектыўны арганізм, які дзейнічае па нейкай другой лініі, якую нельга ўявіць па-за гэтымі сьценамі.

Дні за днямі чаргуюцца бязупынна, нейкія іншыя ад тых, даўжэйшыя за іх, нібы вымаляваныя па нейкім іншым маштабе асобнага статуту. Дзесьці, у душных цяплічах кватэр, у гаршкох канцылярый, павольна, пялёстка за пялёсткай, адцьвітае мэтафізычная красачка каляндару. Доўгія тысячы пройдзеных кілёмэтраў, выцягнутыя ў адну мысьленную нітку, губляюцца недзе ля балоцістых, паросшых чаротам берагоў ракі Арынока.

І толькі ноччу, калі ў сьляпым цыфбляце патаемнага рэгулятара запальваецца важнай мовай электрычных лямпак надпіс: «сон»—сны. Чорныя, бурлівыя хвалі па той бок рэчаіснасьці, якія стрымліваюцца моцным плотам дня і статуту, акружаюць з усіх бакоў выспачку на бульвары Араго. Плот трашчыць, хістаецца. Рака цел, крэдытных білетаў, учынкаў, бутэлек, намаганьняў, лямп, кіёскаў, ног клякочучым валам пераліваецца паверх дахаў з гулам і рыкам. З адкрытых ляп гасьцініц, нібы шуфляды з адкрытых дзьвераў шкафаў, высыпаюцца векавыя, неправетраныя, наскрозь праспаныя матрацы; растуць, грамоздзяцца ўверх вялікай тысячапавярховай бабілёнскай вежай з спружынных сходкамі. А наверсе, на вялікім чатырохспальным матрацы ўсенароднага ложку («Ле лі насіонал»), ляжыць маленькая, бездапаможная Жанэта. На хісткіх сходках уверх лезе мураўінай кучай натоўп мужчын: бляндынаў, брунэтаў, рыжых—каб на хвіліну накрыць яе, абясьсіленную, цяжкой, похаплівай тушай; адзін за адным, усе, горад, Эўропа, сьвет! Вежа трапчыць у перадсьмяротных канвульсіях спружын, хістаецца, згінаецца, рушыцца, заліваная хвалямі разьюшанага мора, якое хлешча разбураючым прыбоем аб скаліста плот выспы сонных голеных рабінзонаў на бульвары Араго.

* * *

Аднойчы нечакана—быццам лопнула раптам якаясьці в пружын беспамылковага да гэтага часу мэханізму—адзінокая камэра П'ера запоўнілася гучна-галоснымі людзьмі з параненымі галавамі, з крывёю, што запяклася на бінтох і на сініх блювах. Патыхнула моцным мужчынскім потам, порахам, заводзкай церкай, смольлю. Паляцелі словы цяжкія, важкія, як булыжнікі: рэвалюцыя, пралетарыят, капіталізм. З урыўкаў фраз, расказаў выразна выяўляўся цьвёрды, чатырохдзенны этап, запісаны крывёю на асфальце.

Зьмест заўсёды аднолькавы.

Беспрацоўе. Урэзаныя зароботкі. Пануры дэманстрацыйны мітынг. З мітынгу, праз горад, паход в «Інтэрнацыяналам».

Правакавала паліцыя. Асаджала ў бакавых завулках, гумавымі палкамі зьбівала да крыві. Затоптаны брук плюнуў ёй насустрач градам булыжнікаў.

Атакавала азьвярэлая салдатня. Залпам выбрукавала вуліцу няўтрамбаванага бруку. У адказ каменныя сківіцы вуліцы вышчарыліся зубамі барыкад.

Была бойня. Ліпкая, цьмяная кроў на тратуарах. Заваленыя людзьмі грузавікі. І натоўп у некалькі дзесяткаў тысяч чалавек—як выкрэсьленая з балянсу лічба, вынесеная на палі, за шэры, няпрыступны плот.

Перадавалі нячуваныя лічбы. Турмы ня ў стане былі зьмясьціць ванадта вялікі ўлоў. У турму Сантэ ўпакавалі нібы пятнаццаць тысяч чалавек. У турме Фрэн, было іх, паводле чутак, яшчэ больш. Турэмныя будынкі акружыў вайсковымі часьцямі. У камэрах, прызначаных для аднаго чалавека, спала папавал на падлозе чалавек пятнаццаць. Каб упікнуць непарадкаў, турэмныя пагулянкі пачалі рабіцца партыямі, у розны час дня.

Дасканалы мэханізм абасобленага сьвету, як перакручаны гадзіньнік, бясьсільна скрыпеў. Яшчэ рухаліся прывычным шляхам стрэлкі, але разьвінчаныя калёсікі, ня трапячы зубцом на зубец, перасковаючы са сьпіцы на сьпіцу цягнулі за сабой хаос шрубак і спружын.

З камэры ў камэру, тысячамі нястомленых даятлоў, і дзень і ноч стукаў турэмны тэлеграф.

Уціснутыя ў агульныя камэры, зьняволеныя патрабавалі пераводу на палітычны рэжым. Турэмнае начальства патрабаваньне адхіліла. Зьняволеныя адказалі галадоўкай.

Кожны дзень, заціснуты ў свой куток, на тапырыўшыся, як вожык, хлябаючы сваю порцыю крупніку і заядаючы яе хлебам, П'ер адчуваў на сабе пятнаццаць пар невясёлых, сталёвых вачэй, пашыраных атрапінам голаду; пад зрокам іх смачны кавалак турэмнага хлеба, набухаючы на драждзях сьліны, затрымліваўся ў яго ў горле, а густы крупнік астываў у місачцы, пакрываючыся гэаграфічнай картай навару.

Здалёк, як праз шкляную сьценку, да яго даляталі доўгія начныя гутаркі. Словы, абчэсаныя, як гнылы, расьлі, лезьлі адно на адно, і праз хвіліну выносіўся ўжо к небу магутны будынак; вось толькі-б выйсьці на сонца, закасаць рукавы—і в сапраўднага каменьня яны пабудуюць яго без памылкі, такімжа прасторным і моцным.

Сьвет, як кепска зьвінчаная машына, больш псуе, чым вырабляе. Так далей нельга. Трэба раскруціць усё, да апошніх шрубак, што няпрыгодна—адкінуць, раскруціўшы,—зьвініць зноў, на славу. Чарцяжы чакаюць гатовыя, у манцёраў чэшуцца рукі, толькі цьвёрдая воля будаўнічога—лом і скрабок. Не, гэтыя людзі не ўмеюць ненавідзець. Замест аднай машыны пагрмазьдзілі сьціртай чарцяжы новай, замяняць адну другой,—і зноў закруцяцца калёсы, зубцы зачэпяцца за зубцы, пацягнуць, панясуць бездапаможныя чалавечыя трускі; і зноў аб чорныя сьпіцы калёс будуць крышыць сабе рукі звар'яцелыя, ахопленыя жахам П'еры, ня ў сілах затрымаць, асадзіць іх хаця-б на хвіліну.

І працягнутая рука П'ера корчылася, уцягвалася ў сэрэдзіну, прыпаднята з падушкі галава павольна ўваходзіла ў плечы, і праз хвіліну на ложку, уціснуты ў прымятую салому, ляжаў не чалавек,—чарапаха ў цяжкой непрасяканай шкарлупцы адзіноцтва.

(Працяг).

1) Пераклад з расійскага выданьня.

Яўрэйскій пісьменьнік І. Фэфэр

(Да яго прыезду ў Менск)

Тав. Фэфэр нарадзіўся на Украіне, рабочы-друкар, былы актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны. Сваю творчую дзейнасьць тав. Фэфэр пачаў у чэрныя гады пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі. Для яго творчасьці першага пэрыяду характэрна адабражэньне грамадзянскай вайны і ўдзелу ў ёй яўрэйскіх рабочых мас. На гэтую тэму тав. Фэфэр даў дасканалыя ўзоры мастацкіх твораў.

З адабражэньнем грамадзянскай вайны ў яўрэйскай паэзіі, тав. Фэфэр адкрыў новую старонку ў гісторыі яўрэйскай пасьлякастрычнікавай літаратуры. Тав. Фэфэр заявіў сябе, як адзін з пачынальнікаў новай яўрэйскай пралетарскай літаратуры, адлюстроўваючы ў сваіх творах рэвалюцыйныя настроі мас, змагаючыся з упадніцкімі дробна-буржуазнымі настроямі ў літаратуры.

З пераходам краіны да мірнага будаўніцтва, тав. Фэфэр арганічна зьвязвае сваю творчасьць з эпохай будаўніцтва сацыялізму. Апошні вялікі твор тав. Фэфэра—гэта «Днепрастрой», назва якога ўжо гаворыць аб сваячасовасьці і надзённасьці праблемы, якая ў гэтым творы закранаецца.

Тав. Фэфэр свабасаблівы і арыгінальны ў формах яго творчасьці. Творчасьць тав. Фэфэра вызначаецца асаблівай яснасьцю мовы, непадробнай шчырасьцю яго матываў. Творчасьць тав. Фэфэра блізка шырокім працоўным масам, сярод якіх ён карыстаецца вялізнай папулярнасьцю і павагаю.

З надрукаваных твораў тав. Фэфэра мы тут адзначым наступныя: «Пра сябе і пра такіх-жа, як я», «У дні простага цуда», «На палёх», «Сьмерць Ільлі», «У старым павіцьці», «Есьць Шкурадзёр», «Хлапцы», «Снапы», «Днепрастрой» і інш.

Гэтымі днямі Украінскае дзяржаўнае выдавецтва выпусьціла кнігу—збор твораў І. Фэфэра.

Пралетарская грамадзкасьць Менску ўжо мела выпадак паўтара гады таму назад сустрэць тав. Фэфэра, аднак пры першым праезьдзе паэта павінен быў абмежавацца толькі адным выступленьнем.

Зараз тав. Фэфэр выступіць у Менску на двух вечарох, што наладжвае культаддзел ЦСПСВ і ЦП саюзу працасьветы; гэта дасьць магчымасьць яўрэйскім рабочым і працоўнай інтэлігенцыі сустрэцца з сваім паэтам.

Д.

Зьняцьце з вучоту біржы за адмаўленьне ехаць у вёску

На ўсесаюзным зьезьдзе дактароў была вынесена пастанова аб больш рашучым накіраваньні дактароў з гарадоў на вучасткі. Як выявілася, у адной толькі РСФСР ёсьць каля 13 тысяч незамешчаных доктарскіх вучасткаў, а беспрацоўных дактароў у гарадох, асабліва ва універсытэцкіх, каля 7 тысяч чал. Вольныя вакансіі маюцца і на доктарскіх вучастках Беларусі.

У сучасны момант рэспубліканская доктарская сэкцыя Беларусі пераглядае ўсе месцы стажораў, ардынатараў і звышштатных ардынатараў з мэтай скарыстаньня іх на вучастках. За адмаўленьне ехаць ў вёску на работу в вучоту Менскай біржы працы зьнята каля 20 зубных дактароў. Апрача таго, ставіцца пытаньне аб выключэньні іх з членаў саюзу.

МЕНСК

ПРАТЭСТ

аб'яднанага сходу літаратурных арганізацый

17-га мая ў доме пісьменьнікаў у зьвязку з арыштам у Парыжы польскага пралетарскага пісьменьніка т. Бруно Ясенскага адбыўся аб'яднаны сход членаў Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў, «Полымя» і «Узвышша».

Інфармаваў сход аб творчасьці таленавітага пралетарскага пісьменьніка тав. Бруно Ясенскага і аб прасьледваньнях яго польскай і францускай буржуазіяй сакратар польскай сэкцыі БелАПП'у тав. Мысьлінскі.

Сходам ухвалена рэзалюцыя пратэсту:

«Крывавая рука фашызму зноў вырвала з нашых радоў пралетарскага пісьменьніка. Тав. Бруно Ясенскі—адзін з першых закардонных пісьменьнікаў, які востра выступіў у літаратуры супроць буржуазіі за пралетарыят. Патрабуем вызваленьня тав. Бруно Ясенскага і клічам яго ў Савецкую Беларусь, дзе ён бязумоўна знойдзе ўсе ўмовы для сваёй літаратурнай творчасьці на карысьць пралетарыяту.

Вытворчая экскурсія гарбароў

Згодна дагавору з саюзам гарбароў Белскуртрэст арганізуе наступныя вытворчыя экскурсіі: абутнікаў па маршруце Масква—Ленінград, чырвонадубшчыкаў—Масква—Вятка, пасадчыкаў—Масква—Кіеў, хромаўшчыкаў і лаячнікаў—Асташкава—Ленінград. Экскурсіі разьлічаны на 26 чал. Месцы разьмяркованы па найбольш буйных прадпрыемствах Белскуртрэсту. Акрамя рабочых у экскурсіях прымуць удзел і некалькі інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў. Першая экскурсія выедзе з Менску 15 чэрвеня. Кожнаму экскурсанту выдаецца па 63 руб. і дармовы праезд.

Аўтадор за работай

У зьвязку з «тыднем» Аўтадору ў Лагойску 13 мая былі вылучаны атрады з 43 камсамольцаў, рабочых і саматужнікаў, якія ў працягу 3-х дзён зрабілі беглы рамонт дарогі Лагойск—Астрашыцкі Гарадок. Усяго адрамантаваны 21 кілёмэтр дарогі.

Фрукты і гародніна для Беларусі

У Менск ужо пачала паступаць з поўдзеню гародніна—радзіскі, агуркі і інш. Праз два тыдні пачнуць паступаць трускалкі, маладая бульба.

У гэтым сэзоне ў Беларусь па лініі каапэрацыі будзе завезена фруктаў і гародніны на 1.683 тыс. руб. Загатоўкамі Белкаапсаюзу будзе ахоплена каля 16 пунктаў Украіны, Крыму, Каўказу, Туркестану. Для найлепшага абслугоўваньня рабочай каапэрацыі ў загатоўчых пунктах вылучаюцца спэцыяльныя ўлаўнаважаныя. Згодна пляну ў Беларусь намячаецца завоз 690 тон маладой бульбы.

****

Справа Тонкашкурава

Учора Менскі акруговы суд пачаў разглядаць справы былога старэйшага інсэктара Менакраддзелу працы Тонкашкурава і былога нам. заг. домам жанчын-адзіночак Скрыбо.

Тонкашкураў пасылае на работу без чаргі, без рэгістрацыі на біржы працы сваіх знаёмых жанчын, з якімі ён быў у «прыяцельскіх» адносінах. Так, па яго пратэкцыі была паслана на работу спачатку ў Цэнтрасьпірт, а потым у кіраўніцтва працкалектывамі нейкая Трушынская. У такім-жа «парадку» былі пасланы на работу Глебко (у ЦСУ), Тамілава (працкалектыў пякароў), Шубдік і інш.

Вечары Тонкашкураў праводзіў з сваімі „прыяцельніцамі“ ў сваім габінэце, альбо ў іх на кватэрах.

Аднак, претэкцыянізм—не адзінае злачынства Тонкашкурава. Тэты «адказны» працаўнік ухітрыўся яшчэ незаконна выдатказаць з фонду барацьбы з беспрацоўем 2.120 руб.

Скрыбо абвінавачваецца ў зьдзеках над жанчынамі з дому адзіночак. Дзякуючы яму, у гэтым доме было некалькі замахаў на самагубства в бочу жанчын.

Тонкашкураў добра ведаў аб паводзінах Скрыбо, але на гэта ня рэагаваў.

На судзе Тонкашкураў прызнае сябе вінаватым толькі ў перавыдатканьні грошай. Абвінавачаньне ў пратэкцыянізме ён адхіляе.

Скрыбо пацьвердзіў, што сапраўды груба адносіўся да жанчын, але зьдзекаў над імі не дапушчаў.

Учора суд пачаў допыт сьведак.

С. Г—н.

За дзень

ПЛЯНІРОЎКА ЦЭНТРАЛЬНЫХ ВУЛІЦ. Прэзыдыум гарсавету запрапанаваў камтасу прыступіць да пляніроўкі Ленінскай і Савецкай вуліц. Ленінская вул. ад пляцу волі да Савецкай будзе сёлета забрукавана брусчаткай.

ХТО НЕ ПАДРЫХТАВАЎСЯ ДА БУДАЎНІЧАГА СЭЗОНУ? Камісія гарсавету ўстанавіла, што Вадаканал пачаў сэзон са спазьненьнем на некалькі дзён. Яшчэ дагэтуль няма праектаў па адлучэньні да каанлізацыі дамаўладальніў на Савецкай і Ленінскай вуліцах. Вадаканалу запрапанавана скончыць праекты да 25 мая.

— ПРЫЕМ У КААПЭРАЦЫЙНЫ ТЭХНІКУМ. Нарнамасьветы разьмеркаваў месцы ў Віцебскі каапэрацыйны тэхнікум. Белкаапсаюзу прадастаўлена 40 месц, Белсельсаюзу—35, Белсельпрамсаюзу—5 месц. На кожнае месца будзе давацца дзьве камандыроўкі. З новага навучальнага году пры тэхнікуме адкрываецца таваразнаўчае аддзяленьне і яшчэ адзін падрыхтоўчы курс:

— БЕЛАРУСКІ КІНО-АТЛЯС. У каня цы мая Белдзяржкіно мяркуе засьняць ва ўсіх акругах Беларусі характэрныя карціны з быту і прыроды БССР. Сцэнары для гэтага кіно-атлясу піша праф. Смоліч. Здымка будзе вытварацца 2-ма групамі Белдзяржкіно.

Пабудуем самалёт і танк

Рэдкалегія заводу «Зьвязда» (Мазыршчына) па выкліку ф-кі «Чырвоны Кастрычнік» ад імя рабкораў і чытачоў уносіць 89 руб. 75 к.

***

Рэдкалегія Лоеўскага РВК (Гомельшчына) па выкліку рэдкалег. ЦВК Бел. уносіць 10 руб.

У панядзелак, 20 мая, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу акрыканкому АДБУДЗЕЦЦА

пасяджэньне сэкцыі аховы здароўя (працяг)

ПАРАДАК ДНЯ: Працяг спрэчак па дакладу прадстаўніка РСІ. Прысутнасьць усіх членаў, кандыдатаў, прымацаваных і делегатак абавязкова, а таксама галоўных урачоў і працаўнікоў лекавых установ.

Беларускія шашачнікі ў Ленінградзе

Першае спатканьне шашачнай каманды Беларусі з ленінградзкімі мэталістымі скончылася на карысьць беларусоў. Ленінградцы, відаць, іграліі нядбайна і да другога матчу ім прышлося падцягнуцца. Сустрэча беларусаў з будаўнікамі скончылася ў карысьць Ленінграду з невялікай перавагаю плюс 6 мінус 5. Беларусы паказалі добрую вытрыманасьць. Тым больш напружана чакалася іх сустрэча са зборнай ЛАСПС. Але барбы па сутнасьці і ня было: ленінградцы вельмі недалікатна расправіліся з гасьцямі, разграміўшы зборную Беларусі з лікам плюс 9 мінус 2. Майстар С. Гардон выйграў ў брата майстра І. Гардона, майстар Рам выйграў другі раз ў Эльлі. Першыя пяць дошак ленінградцаў усе выйгралі.

13 мая ў цэнтральным шахматным шашачным клюбе адбылася апошняя рашучая сустрэча паміж зборнымі камандамі менскіх і ленінградзкіх прафарганізацый. Першыя два матчы выпікаў не далі, Менск выйграў у мэталістых, але прайграў будаўнікам. Таму гэта сустрэча мела асаблівую спартыўную зацікаўленасьць і разыгрывалася пры надзвычайнай напружанасьці абедзьвюх каманд.

Ленінград быў прадстаўлены лепшымі ігракамі, якія ўжо зававялі пачэснае імя на ўсесаюзных спаборніцтвах. Асаблівую зацікаўленасьць прадстаўляла ігра на адной дошцы паміж братамі Гардонамі. Чэмпіён Менску майстар Гардон І. атрымаў у дэбюце лепшую партыю. Потым недакладнай ігрою выпускае супраціўніка і прайграе чэмпіёну Ленінграду майстру Гардону С. В. Касьперскі, які выйграў у Буркоўскага, аказаўся ў гэтым матчы адзіным пераможцаю з усіх менскіх шашачнікаў. Багамольнікаў прайграў Выдровічу. Такім чынам матч выйграны ленінградзкімі шашачнікамі з рэкордным вынікамі +9—2.

Пройгрыш матчу менскімі шашачнікамі ды яшчэ з такімі вынікамі зьяўляецца нечаканасьцю, бо ў ленінградзкай камандзе былі сабраны найлепшыя ленінградзкія шашачнікі прафсаюзаў. Менскія шашачнікі, меўшыя жорсткае паражэньне, бязумоўна, выкарыстаюць вопыт гэтае ігры.

Паведамленьні

Мэдсанпрацы, Стракоўскі—ВСНГ, Ліманскі—саюз камунальнікаў, Лаўрыновіч—ЦВК, Елін—ЦВК.

Фрунзаўскі райком КП(б)Б паведамляе, што ў надзелю, 19 мая, а 1 гадз. дня ў памяшканьні канц. ЖАКТ'у № 8 г. Менску па Чырвонаармейскай вул., № 10, сьлікаецца нарада камуністых ЖАКТ'у па пытаньні аб перавыбарах праўленьня ЖАКТ'у № 8.

— У панядзелак, 20 мая, а 6 гадз. увечары ў памяшканьні Фрунзаўскага РК КП(б)Б адбудзецца нарада шэфтаварыстваў Астрашыцка-Гарадзецкага раёну сумесна з прадстаўнікамі падшэфнага раёну.

Парадак дня: 1. Вынікі вясеньняй пасеўнай кампаніі.

2. Аб асеньняй кампаніі.

3. Арг. пытаньні.

Яўка старшынь шэфтаварыстваў, старшынь жэнсэкцый і членаў райшэфбюро абавязкова.

— 20 мая, а 6 гадз. увечары ў памяшканьні Фрунзаўскага райкому КП(б)Б адбудзецца нарада па пытаньні аб холадзе сацыялістычнага спаборніцтва.

На нараду павінны зьявіцца санітары вытворчых ячэек, старшыні фабзаўкомаў—партыйцы, кіраўнікі прадпрыемстваў—партыйцы і прадстаўнікі ад францыі ЦП саюзу мэталістых, шэйнікаў, друкароў, харчавікоў, дрэваапрацоўшчыкаў, будаўнікоў і гарбароў.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

У нядзелю, 19 МАЯ

апошні раз у гэтым сэзоне АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ —(перанесены з 12 мая)—

ЗАПЯЮЦЬ ВЕРАЦЁНЫ

Астача білетаў у касе тэатру.

Пачатак роўна а 8 з пал. гадз. увечары

КІНО-ТЭАТР „Культура“ — Ад чацьвярга, 16 мая ВЯСЁЛАЯ КАНАРКА

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Адчыненьне скора! НА ЭКРАНЕ сусьветны амэрык. фільм Сачэце за рэклямай!!!

КІНО Інтэрнацыянал — Кіно-рэв'ю ШКЛЯНОЕ ВОКА Пачатак 1-га сэаносу а 7 гадз.

КІНО Пралетарый — Ад аўторка 14 мая ЗЬВІНІГАРА Пачатак а 7 г. 15 м. Каса—ад 6 г.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр ЮНЫ ПІЯНЭР (будынак кіно „ПРАЛЕТАРЫ“) — АД АЎТОРКА, 14 МАЯ СТЭНЛЕЙ У ГЛЫБІ АФРЫКІ апошняя 4-я сэрыя ў 9 частк. Пачат. 1-га сэансу а 3 гадз. дня.

КІНО Спартак — Амэрыканскі сусьветны фільм драма ў 8 част. ПАРЫЖАНКА Пастаноўка Чарлі Чапліна Зьвыш праграмы—выступл. П. В. РОНСКАЙ сатырыка В. ГУРСКАГА ў новым рэпэртуары

КІНО „КУЛЬТУРА“ У панядзелак, 20 мая

Адбудзецца адзіны вялікі мастацкі КАНЦЭРТ

ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ

Народны артыст рэспублік прэм'ер 1-га Маскоўскага Вялікага Мастацкага тэатру Васіль Іванавіч КАЧАЛАЎ

Заслужаны артыст рэспублікі—праф. Маскоўск. Кансэрваторыі, салісты Маскоўск. Вялікага акад. тэатру Барыс Осіпавіч СІБОР (скрыпка)

Артыстка Маскоўск. муз. студыі імя Народнага артыстага рэспублікі К. С. Станіслаўскага Галіна Мікалаеўна ГАРШУНОВА

ПРЭМ'ЕРЫ МАСКОЎСКАГА ВЯЛІКАГА АКАДЭМІЧНАГА ТЭАТРУ

БАЛЕТМЭЙСТАР ЛЕАНІД ЖУКАЎ — Прыма-балерына КАНДАУРАВА — Вольны мастак С. К. СТУЧЭЎСКІ (РАЯЛЬ)

Падрабязнасьці ў праграмах.

УСЕ БІЛЕТЫ НА ГЭТЫ КАНЦЭРТ—ПРАДАНЫ ПРАЗ ТЭАТРАЛЬНУЮ ЛЁТАРЭЮ

Усе віды прапусноў на гэты канцэрт не маюць моцы

Выйгрышныя білеты абменьваюцца на тэатральныя білеты на канцэрт у акруговым МОПР'у (Савецкая, 87, другі паверх) і ў дзень канцэрту ў касе кіно.

Пачатак роўна а 8 г. 30 м. пасьля пачатку канцэрту ўваход у залю будзе бязумоўна зачынены.

Лётарэйная камісія Менакр. МОПР'у.

Украинский органо-терапевтический институт Наркомздрава УССР и Харьков. Медиц. Общества ИЗГОТОВЛЯЕТ:

СПЕРМОЛЬ (Вытяжка з семенных желез) — Применяется при неврастении, при слабости сердца, для укрепления всего организма...

ГЕМАТОГЕН (Препарат крови) — Применяется при малокровии, золотухе, рахите и туберкулезе...

ФОСФРЕН (Фосфор для мозга) — Применяется при упадке сил умственных и физических, при малокровии, нервном истощении...

И ДРУГИЕ ОРГАНО-ПРЕПАРАТЫ (аварин, тиреоидин, простатин и др.)

Продажа во всех аптеках и магаз. сан. гигиены СССР

Склад: Харьков, Рымарская ул. № 28, тел. 17

ЗЬВЯЗДА — ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ НА КЛІШЭ

МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ

З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА“: МЕНСК, САВЕЦКАЯ, № 63, 3-ЦІ ПАВЕРХ.

ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭНЬНІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ і іншыя МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ. ВЫТЯЖКА ИЗ СЕМЕННЫХ ЖЕЛЕЗ. ПРЕЙСКУРАНТ ВЫСЫЛАЕТСЯ БЕСПЛАТНО. ЦЕНА ФЛАКОНА 2 РУБЛЯ. ПЕРЕСЫЛКА ЗА НАШСЧЕТ. ВРАЧАМ ДЛЯ ИСПЫТАНИЙ GRATIS. ГАЛЕН-МОСКВА

Полацкаму Акрза ПАТРЭБНЫ для працы ў ільнаводных раёнах 9 агранамаў паляводаў і 6 льнотэхнікаў з аплатай 100 р. у месяц, 20 р. разьездных і 5 р. кватэрных і адзін АКРІЛЬНАВОД з аплатай 125 р. Заявы з паказаньнем адукацыі і стажу накіроўваць г. Полацак, АКРЗА

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

Не спажывайце алькагольных напіткаў, шкодных для здароўя.

ПЕЦЕ толькі КАУКАСКІЯ НАРЗАН — Натуральныя Мінэральныя Воды

ЭСЕНТУКІ № 20 — Адзіныя сталовыя воды с натуральнай вуглякіслатой.

ЭСЕНТУКІ № 4, № 17, № 18 | БАТАЛІНСКАЯ СЬМІРНОЎСКАЯ СЛАВЯНАУСКАЯ | БАРЖОМ

Са складу 25 % адпускаюцца па гуртавых цэнах. З дармовай дастаўкай на дом.

Заказы вагонамі прымаюцца па зьніжаных цэнах і асобна ільготных умовах.

КАРЫСТАЙЦЕ КАЎКАЗ на ДАМУ!

Замяняйце ўсе напіткі толькі адзіна-карысьнымі каўкаскімі водамі!

Раённы склад Белмэдгандлю: Менск, рог Савецкай і Энгельса 26-92, тэл. 374.

ЗЬВЯЗДА

УМОВЫ ПАДПІСКІ: На 1 мес.—90 к. На 3 мес.—2 р. 60 к. На 6 мес.—5 р. — На 9 мес.—7 р. 50 к. На год—9 р. 75 к.

ЗЬМЕНА АДРАСУ: Мясцовага—10 к. Іншагародн.—20 к.

Цана асобнага нумару ўсюды 5 к.

ПАДПІСКА І АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА: у Гал. канторы газ. „Зьвязда“ (Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх) ад 9 гадзін раніцы да 5 гадзіны дня; у акругов. гарадох—у аддз. БДВ, у аддз. выд-ва „Известия“ і „Правда“ і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

ПЛАТА за АБВЕСТКІ: за радок нонпарэлі пасьля тэксту—50 кап.; іншагароднія—1 рубель. Паперод тэксту ў два разы даражэй.

Пры шматразовым друкаваньні — скідка па згодзе.

Згодна пост. СНК ад 10-IX 1924 г. бярэцца зьверх тарыфу 10 проц. падатку.

Рэдакцыя і Галоўная Кантора: МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63. Тэлеграфны адрас: МЕНСК, „ЗЬВЯЗДА“.

— Тэлефоны —

Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Начны рэдактар ад 6 гадзін увечары (дружарня) . . 6-42
Парт. аддзел
Аддзелы: заможнай і ўнутр. інфармацыі 13-80
Аддзел рабсельскораў і бюро расьсьледаваньня . . . 6-19
Галоўная кантора
Аддзелы падпіскі і абвестак . 7-81

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты лічыць несапраўднымі:

Пасьведч. на права ўладаньня домам Карпейчыка Ф. М., выд. менкамгасам. 1679

Бучотная картка, выд. Александрыйскім ваенкаматам, чырвонаарм. пасьведч. і пахвальны ліст, выд. 63 палком 7-й дывізіі на імя Варона Ф. К. 1680—1682

Каап. кн. Скаткойскага У. Л., выд. ТПО МБВ ч. 1683

Каап. кн. Асаенак А. С., выд. Менскім прыгар. спажывецкім т-вам «Землярвб». 1684

Пашпарт, выд. Омскай міліцыяй, вайсковая кн., выд. Омскім ваенк. Ленера А. І. 1685—1686

Часовае пасьвед. замест асабов. кн., выд. Артанск. ваенкаматам, кандыдацкая картка КП(б)Б № 17351, выд. Артанск. акругкомам на імя Асташонка П. З. 1687—1688

Вайск. кн. Добкіна Л. А., выд. Бабруйскім ваенкаматам 1689

Кн. беспрац. № 22310 Сьлячэн М. А., выд. Менстрахкасай. 1690

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА“ звяніце па тэл. 2-49

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск

Менск Галоўлітаў № 501.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2